Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ



5 2472

№ 22 ЛІСТАПАД 1934 Г.

Ад Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)

Цэнтральны камітэт ВКП(большэвікоў) з вялікім жалем паведамляе партыю, рабочы клас і ўсіх працоўных Саюза ССР і працоўных усяго света, што 1-га снежня ў Ленінградзе ад здрадніцкай рукі ворага рабочага класа загінуў выдатны дзеяч нашай партыі, палкі, бясстрашны рэволюцыянер, любімы кіраўнік большэвікоў і ўсіх працоўных Ленінграда, сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага камітэтаў ВКП(большэвікоў), член палітбюро ЦК ВКП(б) таварыш СЯРГЕЙ МІРОНАВІЧ КІРАЎ.

Страта таварыша Кірава, любімага ўсёй партыяй і ўсім рабочым класам СССР, крыстальна чыстага і непахіснага, стойкага партыйца-большэвіка-ленінца, аддаўшага ўсё сваё яркае, слаўнае жыццё справе рабочага класа, справе комунізма, з'яўляецца самай цяжкай стратай для ўсёй партыі і краіны Советаў за апошнія гады.

Цэнтральны Камітэт верыць, што памяць аб таварышу Кіраве, светлы прыклад яго бясстрашнай, настойлівай барацьбы за пролетарскую рэволюцыю, за будаўніцтва соцыялізма ў СССР будуць натхняць мільёны пролетарыяў і ўсіх працоўных на далейшую барацьбу за таржэство соцыялізма, за канчатковае выкараненне ўсіх ворагаў рабочага класа.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў).

АД ЗДРАДНІЦКАЙ РУКІ ЗАГІНУЎ САКРАТАР ЦК І ЛЕНІНГРАДСКАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

тав. С. М. КІРАЎ

Нашу партыю пасцігла вялікае няшчасце. 1 снежня ад рукі злачынцы забойцы, падасланага класавымі ворагамі, загінуў таварыш КІРАЎ. Не толькі для нас, яго блізкіх сяброў і таварышоў, але і для ўсіх ведаўшых яго па рэволюцыйнай рабоце, ведаўшых яго як байца, таварыша і друга, смерць Кірава з'яўляецца нічым неўзнаградзімай утратай. Ад рукі ворага загінуў чалавек, які ўсё сваё яркае жыццё аддаў справе рабочага класа, справе комунізма, справе вызвалення чалавецтва.

Тав. Кіраў прадстаўляў з сябе ўзор большэвіка, не ведаўшага страху і труднасцей у дасягненні вялікай мэты, пастаўленай партыяй. Яго прамата, жалезная стойкасць, яго здзіўляючыя якасці натхнёнага трыбуна рэволюцыі спалучаліся ў ім з той сардэчнасцю і мяккасцю ў асабістых таварыскіх і сяброўскіх адносінах, з той прамяністай цеплынёй і скромнасцю, якія ўласцівы сапраўднаму ленінцу.

Таварыш Кіраў працаваў у розных частках Саюза ССР і ў часы падполля і пасля Кастрычніцкай рэволюцыі—у Томску і Астрахані, ва Владзікаўказе і Баку—і ўсюды ён высока трымаў сцяг партыі і завяёўваў для справы партыі мільёны працоўных сваёй нястомнай, энергічнай і пладатворнай работай рэволюцыянера.

Апошнія 9 год таварыш Кіраў кіраваў арганізацыяй нашай партыі ў горадзе Леніна і Ленінградскай вобласці. У кароткім сумным пісьме няма магчымасці даць ацэнку яго дзейнасці сярод працоўных Ленінграда. Трудна было-б знайсці ў нашай партыі больш падыходзячага кіраўніка для рабочага класа Ленінграда, так умела спаяўшага ўсіх партыйцаў і ўвесь рабочы клас вакол партыі. Ён стварыў ва ўсёй ленінградскай арганізацыі атмасферу большэвіцкай арганізаванасці, дысцыпліны, любві і адданасці справе рэволюцыі, якімі адзначаўся сам т. Кіраў.

Ты быў блізак усім нам, таварыш Кіраў, як верны друг, любімы таварыш, надзейны саратнік. Да апошніх дзён свайго жыцця і барацьбы мы будзем успамінаць цябе, дарагі друг, і будзем адчуваць горыч нашай утраты. Ты быў заўсёды з намі ў гады цяжкіх баёў за таржэство соцыялізма ў нашай краіне. Ты быў з намі заўсёды ў гады хістанняў і труднасцей унутры нашай партыі, пражыў з намі ўсе труднасці апошніх год, і мы страцілі цябе ў момант, калі наша краіна дасягнула вялікіх перамог. Ва ўсёй гэтай барацьбе, ва ўсіх нашых дасягненнях многа тваёй долі, многа тваёй энергіі, сілы і палкай любві к справе комунізма.

Прашчай, наш дарагі друг і таварыш Сяргей!

І. Сталін,
С. Орджанікідзе,
В. Молатаў,
М. Калінін,
К. Варашылаў,
Л. Каганавіч,
А. Мікаян,
А. Андрэеў,
В. Чубар,
А. Жданаў,
В. Куйбышэў,
Я. Рудзутак,
С. Касіор,
П. Постышэў,
Г. Петроўскі,
А. Енукідзе,
М. Шкіратаў,
Ем. Яраслаўскі,
Н. Ежоў.

УРАДАВАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

1 снежня ў 16 гадзін 30 мінут у гор. Ленінградзе ў будынку Ленінградскага Совета (быўшы Смольны) ад рукі забойцы, падасланага ворагамі рабочага класа, загінуў Сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага Камітэтаў ВКП(большэвікоў) і член Прэзідыума ЦВК СССР таварыш СЯРГЕЙ МІРОНАВІЧ КІРАЎ. Страляўшы затрыман. Асоба яго высвятляецца.

Сяргей Дарожны

ПАМЯЦІ т. КІРАВА

Я слухаю ноч. З надзор'яў
Ляціць апантаны вецер.
Гудзе несупынны провад
І стукае сэрца маё...
Дзе сілу знайсці такую,
Каб вырваць жыццё у смерці,
Каб зноўку жывы і нязломны
Над намі узняўся ён?

Каб з намі ён быў заўсёды
І вёў нас у бой астатні—
Вялікі баец, падпольнік
Рэспублікі верны сын!
Дзе слова знайсці такое,
На боль наш і горач страты,
Сэрца маё агністае,
Радзіма мая, скажы?

І голас мой ціхне. Ў горад
Ляціць апантаны вецер,
Гудзе несупынны провад
І стукае сэрца маё...
— Над ім яшчэ здрадны пошчак
Халоднага стрэлу б'ецца,
І свежая кроў дыміцца,
Як помста і як праклён.

Я з болем вяду гэту песню
І слухаю гул далёкі.
Рэспубліка узнімаецца—
Імчацца яе паезды,
Грукочуць яе заводы,
І слава ляціць высока
над тундрамі,
І над горамі,
Праз межы і праз гады.

У ёй мужнасці нашай сіла,
У ёй лепшых сыноў адвага,
Над ёю палае штандар
Ленінскі не дармо,
Каторы здабыты ў бойках
Крывёй нашай, смерцю, смагай
Каторага мы нікому
Ніколі не аддамо!

Мацуй-жа нам сэрцы, нянавісці
І гнеў да варожай зграі!
Расці наша слава!
Сонца
Вялікае нам свеці!
На рэха варожых стрэлаў
Мы мужнасць сваю ўзнімаем,
Каторая з намі заўжды
Ішла і будзе ісці.

2-XII—34 г.
Менск.

Першыя вынікі выбараў у советы

484 сельскіх советаў закончылі выбары новых дэпутатаў. Распачалася ўжо справаздачная кампанія і гарадскіх советаў. Першыя далёка няпоўныя вынікі справаздачна-выбарчай кампаніі паказваюць на небывалы рост актыўнасці і энтузіязма шырокіх працоўных мас горада і вёскі. Як справаздачная кампанія, так і выбары новых дэпутатаў у советы, праходзяць на больш высокім палітычным узроўні і лепш арганізаваны ў параўнанні з мінулымі выбарамі.

Тав. **Карэльская**— работніца фабрыкі „Окцябр" у другі раз абрана дэпутатам Менскага горсовета.

Гіганцкі рост соцыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі за перыяд, які аддзяляе нас ад ранейшых выбараў, адчуваецца і ў ходзе саміх выбараў гэтага года. На выбарах у большасці раёнаў і советаў выступае новая сіла, гэта сіла калгаснікаў, апора совецкай улады на вёсцы.

Адгэтуль небывалы бурны рост актыўнасці выбаршчыкаў, якія ідуць на справаздачныя і выбарчыя сходы. Па 1492 сельскіх выбарчых участках, дзе на 17 лістапада закончаны выбары новых дэпутатаў у советы, на выбарчыя сходы ў сярэднім з'явілася больш 80 проц. выбаршчыкаў, замест 66,3 проц. сярэдняй яўкі ў мінулую выбарчую кампанію.

На небывалую вышыню ўзнялася актыўнасць жанчын. З 618 тысяч выбаршчыкаў, прымаўшых удзел на выбарчых сходах, жанчын — 395 тысяч.

У сярэднім на асобных выбарчых участках і нават па цэлых сельсоветах яўка жанчын на выбарчыя сходы была больш высокай чым яўка мужчын. Напрыклад, на выбарчым участку ў в. Ляды, Драчкоўскага сельсовета, Чэрвеньскага раёна, з 72 жанчын выбаршчыкаў на выбарчы сход з'явілася 71. Па Яромаўскаму сельсовету, Аршанскага раёна, пры 95 проц. яўкі на сходы ўсіх выбаршчыкаў яўка жанчын складае 97 проц.

Значна ўзрос процант абраных у советы жанчын. Калі ўзяць некаторыя паасобныя раёны, то ў процантных адносінах мы маем больш-менш здавальняючае становішча. Так па Ушацкаму раёну абрана ў советы 32 проц. жанчын, у Плешчаніцкім—33 проц., у Асіпавіцкім—30, у Глускім—30.

Але па БССР мы маем значна меншы процант. Так з 21.532 дэпутатаў, абраных у новы склад сельскіх советаў, жанчын абрана 5619 або 26,1 проц. агульнай колькасці новаабраных дэпутатаў.

Гэты процант хаця і з'яўляецца куды большым, чым быў у мінулую выбарчую кампанію, тым не менш з'яўляецца яшчэ далёка недастатковым. Тут з боку асобных выбарчых камісій праяўлена недаацэнка ўдзелу жанчын у рабоце советаў. Возьмем для прыклада Бокшыцкі сельсовет, Слуцкага раёна. Тут з 28 новаабраных дэпутатаў, жанчын толькі 4. Нельга не падкрэсліць, што зусім не рэдка гэта недаацэнка наглядаецца нават з боку адказных раённых работнікаў. Намеснік старшыні РВК Чырвона-Слабодскага раёна тав. Іванкоў, напрыклад, адкрыта заяўляе, што 35 проц. жанчын у члены советаў забяспечанымі быць не могуць з прычыны адсутнасці адпаведных кандыдатур.

Ці варта даводзіць, што такія Іванковы не бачаць, што дзесяткі, сотні і тысячы жанчын работніц і калгасніц, выбраных у советы і вылучаных на адказныя работы, спраўляюцца з даручанымі ім абавязкамі не толькі не горш, а нават лепш за тых-жа Іванковых. У іх трэба вучыцца Іванковым, як трэба працаваць. Прывядзем некаторыя факты:

Член Менгорсовета работніца завода „Комунар" тав. **Акуценка** кіруе дэпутацкай групай завода. Дэпутацкая група абрасла актывам і налічвае 64 чалавека. Асабліва велізарную работу група правяла па палепшанню быта рабочых, напрыклад рамонт кватэр і інтэрната, палепшанне работы дзіцячых установ і т. д.

Член Ляскавіцкага сельсовета, Глускага раёна, тав. **Кіпель Юстына**, першая ўступіла ў калгас. Яна з'яўляецца самай лепшай ударніцай у калгасе. Яна паказвае, як трэба змагацца за заможнае калгаснае жыццё. За добрую работу Кіпель Юстыну некалькі раз прэміравалі.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што жанчына зараз выросла ў актыўнага барацьбіта за соцыялізм. Забяспечыць шырокі ўдзел жанчын у рабоце советаў, выбраць дэпутатамі лепшых з лепшых ударніц фабрык заводаў, соўгасаў і калгасаў—нашы першачарговыя задачы.

Напярэдадні справаздачна-перавыбарчай кампаніі рабочыя ўдарнікі перадавых прадпрыемстваў абвясцілі вытворчы паход імя VII ўсесаюзнага з'езда советаў. Сустрэць з'езд советаў з лепшымі вытворчымі паказальнікамі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва—вось задачы, якія паставілі перад сабой ударнікі перадавых прадпрыемстваў. Гэты паход пракаціўся шырокай хваляй соцыялістычнага спаборніцтва па ўсяму неабсяжнаму Совецкаму Саюзу.

Тав. **Цяцерская**—лепшая ўдарніца калгаса імя Леніна, памочнік брыгадзіра—абрана ў члены Івана-Агародніцкага сельсовета (Слуцкі раён).

Вытворчы паход імя VII з'езда советаў адначасова з барацьбой за лепшыя вытворчыя паказальнікі ператварыўся ў паход за культурную перабудову калгаснай вёскі, за перабудову быта калгаснікаў. У гэты паход уключыліся жанчыны. Яны правялі барацьбу з антысанітарыяй, гразёю, некультурнасцю. Гэта барацьба пачалася не толькі ў кватэрах, але і ў калідоры, на дварэ, перайшла на вуліцу, дабралася да калодзежа, лазні.

Ранейшая вёска Паганцы, Рокшынскага сельсовета, Парыцкага раёна, страціла сваю гістарычную назву Паганцы. Калгаснікі і калгасніцы калгаса імя Войкава ператварылі яе ў культурную калгасную вёску. Рыхтуючыся да справаздачна-выбарчай кампаніі яны паабапал вуліцы пракапалі равы, супроць кожнага двара праклалі мосцікі і ўсцяж усёй вуліцы праклалі тратуары, ачысцілі двары, пабудавалі лазню, адрамантавалі калодзежы і прымацавалі да іх агульныя вёдры.

А такіх фактаў можна прывесці сотні з Аршанскага, Барысаўскага, Мазырскага і інш. раёнаў. Усе гэтыя факты вельмі выразна гавораць аб тым, што старая вёска з усімі яе гістарычнымі назвамі, накшталт, Паганцы, Старышча, Студзёнка, Багданава, Пагарэлае, Забалоцце, Чорная Лаза, Войханы, якія сведчылі аб гразі, некультурнасці, галечы і жабрацтве вясковага насельніцтва—памірае, замест яе вырастаюць новыя культурныя заможныя калгасныя вёскі.

Зразумела, у гэтым напрамку прадстаіць яшчэ вялікая работа. Трэба дабіцца, каб у паход за культурны быт уключыліся ўсе советы, усе калгасы, калгаснікі і асабліва жанчыны.

Гаворачы аб ходзе справаздачна-выбарчай кампаніі гэтага года, нельга абыйсці і таго, як гэту кампанію сустракаюць аднаасобнікі. Тысячы сумленных працоўных аднаасобнікаў напярэдадні выбараў уступаюць у калгасы. Арганізаваны дзесяткі і сотні новых калгасаў. Цэлы рад сельсоветаў у асноўным закончылі суцэльную калектывізацыю. Бліжэйшая задача — закончыць калектывізацыю ўсёй БССР. За вырашэнне гэтай задачы павінны змагацца ўсе сельсоветы, уся пролетарская грамадскасць.

Было-б вялікай памылкай не спыніцца і на тых недахопах, якія ёсць у асобных раёнах і сельсоветах у справаздачна-выбарчай кампаніі. Адсутнасць належнай класавай пільнасці ў гэтых сельсоветах прыводзіла да таго, што пралезшыя ў советы кулакі і падкулачнікі падрывалі работу советаў, тармазілі выкананне заданняў дзяржавы, развальвалі калгасы.



Тав. Жылевіч— ударніца-зотаўка Менскай шчотачнай фабрыкі, маладая выбаршчыца.

Цітаў Макар член Панкратаўскага сельсовета, згрупаваўшы вакол сябе аднаасобнікаў, агітаваў іх супроць уступлення ў калгасы. Падобныя людзі імкнуцца ўсімі сіламі прабрацца ў советы і ў гэту выбарчую кампанію.

У Чырвона-Асавецкім сельсавеце, Быхаўскага раёна, на двух выбарчых пунктах мелі месца выпадкі вылучэння ў новы склад сельсовета кандыдатур сваякоў бандытаў, яўных сабатажнікаў. У Тошчыцкім сельсавеце, гэтага-ж раёна, класава-варожыя элементы імкнуліся запалохаць актыўных членаў совета, падпальвалі неаднаразова іх хаты. У Шклоўскім раёне кулак Дзямідаў са сваім сынам арганізавалі напад на старшыню сельсовета і пабілі хатніка Іванова.

У радзе раёнаў у рэзультаце дрэнна праведзенай арганізацыйна-масавай работы, вельмі нізкая яўка выбаршчыкаў на сходы. Да такіх раёнаў адносяцца Магілеўскі, Бялыніцкі, Церахаўскі, Чэрвеньскі і інш. У некаторых раёнах і сельсоветах груба парушаецца выбарчае законадаўства.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што маюцца яшчэ сельскія советы і нават раёны, якія недастаткова ўвагі адлаюць падрыхтоўцы і правядзенню масавай работы, асабліва сярод жанчын. Недахопы гэтыя павінны быць улічаны і выпраўлены ў далейшай рабоце. Трэба дабіцца таго, каб выбары гэтага года забяспечылі сапраўды баявыя працаздольныя советы, здольныя змагацца за ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада, здольныя не на словах, а на справе будаваць соцыялізм.

„Трэба мець на ўвазе, што рост магутнасці совецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленне апошніх рэштак паміраючых класаў. Іменна таму, што яны паміраюць і дажываюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм наскокаў да другіх, больш рэзкіх форм наскокаў, апеліруючы да адсталых пластоў насельніцтва і мабілізуючы іх супроць совецкай улады" (Сталін).

Адгэтуль класавая пільнасць павінна быць узмоцнена, павінна быць звернута асаблівая ўвага на падбор кандыдатур у советы. Нельга лічыць здавальняючым 26 процантаў жанчын, абраных у советы і асабліва на кіруючую работу. На 21-XI па 32 раёнам абрана 55 жанчын старшынь сельсоветаў, намеснікаў старшынь—218. Але раёны, Бягомельскі, Чэрвеньскі і Чавускі не абралі ні адной жанчыны старшыні сельсовета. Нельга цярпець такой недаацэнкі жанчын, якую мы маем у азначаных раёнах. Партыйныя і совецкія арганізацыі ў далейшым павінны ліквідаваць гэтую апартуністычную недаацэнку.

Справаздачна-выбарчую кампанію трэба скарыстаць для яшчэ большага ўзмацнення выканання ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній з тым, каб з'езды советаў сустрэць з яшчэ большымі і лепшымі вытворчымі паказальнікамі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, з паказальнікамі закончанай у асноўным калектывізацыі БССР і перавыкананнем промфінпланаў на фабрыках і заводах.

„Выбіраючы ў советы лепшых людзей нашай краіны, яшчэ шчыльней з'яднаемся вакол комуністычнай партыі, яе кіраўніка і правадыра ўсіх працоўных—таварыша Сталіна"

М. І. КАЛІНІН.

СПРАВАЗДАЧНАЯ НА ФАБРЫЦЫ „ОКЦЯБР“

Справа налева тт. Гурыновіч і Фейгенбаум.

Актыўна прайшлі справаздачы дэпутатак горсовета на фабрыцы „Окцябр“. Работніца Гурыновіч з 1924 года з'яўлялася дэпутаткай горсовета. За гэты час шмат чаго было ёю зроблена. Працавала ў розных секцыях—нарасветы, кааперацыйнай, РСІ і інш. Тав. Гурыновіч арганізавала добраахвотны швейны гурток з жонак рабочых пры дзіцячым садзе, якія рабілі пашыўкі для дзяцей, устанаўліваючы дзяжурствы пры дзіцячым доме і т. д.

Тав. Гурыновіч на працягу сваёй работы ў горсовеце значна выросла. Зараз тав. Гурыновіч з'яўляецца лепшай ударніцай фабрыкі. На XV з'ездзе КП(б)Б яна была абрана членам ЦК КП(б)Б. Цяпер з'яўляецца парторгам другога цэха і членам парткома. Яе цэх у часе падрыхтоўкі да перавыбарчай кампаніі ішоў упарадзе па актыўнаму наведванню сходаў, і па збору рабочых прапаноў у наказ.

Дэпутатка тав. **Файгенбаум** шмат зрабіла за 4 гады ў горсовеце. Працуючы ў бытавой секцыі, яна абследвала жакты № 7, 24, 32, дабілася рамонту кватэр для жыхароў гэтых жактаў Шмат папамагла ў рамонце кватэр рабочым нашай фабрыкі. Так, па яе ініцыятыве быў праведзен рамонт у тт. Фішкінай і Кантаровіч.

Работніца Васюкевіч 6 год не мела добрай кватэры, але т. Файгенбаум паставіла пытанне на прэзідыум горсовета і тав. Васюкевіч атрымала кватэру.

Усе выбаршчыкі ведаюць, што тав. Файгенбаум з'яўляецца актыўнай дэпутаткай горсовета і да яе звараčаюцца за парадамі. У гэтым сэнсе яна шмат дапамагае нашым работніцам.

Тав. Файгенбаум добрая ўдарніца на вытворчасці. Яна часта замяняе рэзерв невыходзячых па хваробе рабочых і штодзённа перавыконвае промфінплан.

Дэпутатка т. **Карэльская** усяго 8 месяцаў працуе ў горсовеце ў секцыі аховы здароўя. За гэты час яна абследвала ЦРП (цэнтральную рабочую паліклініку), медычную раённую дапамогу і інш.

Тав. **Карэльская** дапамагла ў рамонце кватэр нашым рабочым тт. Ліпман, Сырэль, Ушэр. Яна кажа, што гэтая работа вельмі цікавая, але яна не магла аддаць ёй больш часу, таму што мае шмат нагрузак—з'яўляецца парторгам брыгады, і вучыцца ў комвузе. Гэтыя жанчыны дэпутаткі сапраўды апраўдалі давер'е выбаршчыкаў, якія імі ганарацца.

Але-ж побач з імі былі і такія, як Бейленсон, Шварберг, Каждан, якія прымалі слабы ўдзел у рабоце горсовета.

У новы склад Советаў мы абралі працаздольных, актыўных, лепшых работніц ударніц, такіх як Карэльская, Файнгенбаум і другія, якія на справе паказалі ўзорныя прыклады ў рабоце горсовета.

Падольская.

Менск, фабрыка „Окцябр“.

У СЕЛЬСОВЕТ АБРАНЫ ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІЦЫ

Справаздачна-перавыбарчая кампанія Советаў праходзіць пад знакам яшчэ большага ўмацавання Советаў—органаў дыктатуры пралетарыята. Гэта кампанія праходзіць пад знакам выканання гістарычных рашэнняў XVII партз'езда.

Некаторыя сельсоветы па-большэвіцку аразумелі задачы падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Кішча-Слабодскі сельсовет, Барысаўскага раёна увязаў перавыбарчую кампанію з выкананнем чарговых гаспадарча-палітычных задач, пад знакам далейшага ўмацавання калгасаў і прыліву ў іх працоўных аднаасобнікаў. Аб гэтым гавораць факты.

Да справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсовет поўнасцю выканаў усе абавязкі перад дзяржавай, арганізаваў два новых калгаса, і пабудаваў сваю электрастанцыю, якая абслугоўвае бліжэйшыя вёскі.

У хатах калгаснікаў загарэлася лямпачка Ільліча. Калгаснікі ўлэўнена і радасна ідуць да заможнага жыцця.

Лепшым прыкладам заможнасці з'яўляецца жыццё сям'і калгасніка Навіцкага Ілы, былога батрака (калгас „Чырвоная зорка“). Вось, што кажа аб сабе т. Навіцкі:

— Раней працаваў я батраком у памешчыка, у доме якога цяпер змяшчаюцца нашы калгасныя яслі. Дзень і ноч працаваў я на пана, а сабе на жыццё не хапала.

У 1923 годзе, калі арганізавалі калгас, я ўступіў першым і вось ужо 11 год з'яўляюся калгаснікам. Зусім змянілася маё жыццё, я стаў жыць заможна. Цяпер я атрымаў з калгаса карову, маю свіней і іншую дробную жывёлу.

У гэтым годзе я жыву яшчэ лепш. Атрымліваю 56 пудоў жыта, акрамя гэтага шмат ячменя, пшаніцы, гароху, аўса і бульбы Хопіць сабе і выкарміць жывёлу. Працуем разам з жонкай, а дзеці знаходзяцца ў калгасных яслях—яны там сытыя і вясёлыя. Жыццё наша стала радасным. Вось да Окцябрскіх свят электрычнасць увялі ў хату. Святло такое прыемнае, што нават і тушыць не хочацца.

Такіх калгаснікаў як Навіцкі восць дзесяткі і сотні па сельсовету і Барысаўскаму раёну.

* * *

Не дрэнна сельсовет арганізаваў яўку сваіх выбаршчыкаў на справаздачна-выбарчыя сходы. Напярэдадні схода была праведзена масава-растлумачальная работа сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Распрацоўвалі адозвы ЦВК СССР і БССР аб выбарах у советы.

У дні выбараў былі арганізаваны паходныя дзіцячыя яслі, з тым каб кожная працоўная жанчына магла прыняць актыўны ўдзел у выбарчым сходзе. Пасля такой падрыхтоўкі былі належныя і вынікі,—на сход з'явіліся ўсе выбаршчыкі, акрамя хворых і тых што ў ад'ездзе. Процант яўкі жанчын быў пераважны. Калі яўка мужчын па сельсовету была на 78,4 проц., то жанчын 90,6 проц. Гэты факт яшчэ раз сведчыць аб актыўным удзеле жанчын у выбарах Советаў, і аб вялізарнейшым росце палітычнай свядомасці жанчын.

Выбарчыя сходы праходзілі арганізавана. З вялікай актыўнасцю абгаварваўся наказ сельсовету.

У новы склад сельсовета абрана 36 чалавек з якіх 33 калгасніка-ўдарніка і 3 аднаасобніка. Значна большае месца ў гэтых выбарах занялі працоўныя жанчыны. У мінулых выбарах у складзе сельсовета была ўсяго 4 жанчыны, а цяпер абрана 11 жанчын лепшых ударніц-калгасніц.

Новаму складу сельсовета выбаршчыкі далі наказ, у якім яны патрабуюць наладзіць тэлефонную сувязь з калгасамі, адрамантаваць вуліцы і дарогі, радыёфікаваць усе калгасы і вёскі, нашырыць электрыфікацыю і інш.

Новы наказ павінен быць штодзённай праграмай у рабоце сельсовета. Кіруючыся наказам, сельсовет зможа выканаць задачы другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

Б.

ЖАНЧЫН-УДАРНІЦ—У СОВЕТЫ

Асаблівае значэнне набывае высунутая прэзідыумам ЦВК СССР задача „далейшага пашырэння прадстаўніцтва жанчын у складзе дэпутатаў советаў. Без гэтага советы не адлюстравалі-б сённешняга дня нашай краіны,

Тав. Штэйнберг Эльза—калгасніца, абрана старшынёй Усакінскага сельсовета, Клічаўскага раёна.

важнейшых якасных зрухаў, якія адбыліся ў ёй і не змаглі-б поўнасцю ахапіць сваёй работай найбольш адсталыя слаі працоўных".

Справаздачна - перавыбарчая кампанія советаў 1934 года яскрава паказала ўсё больш узрастаючую актыўнасць працоўных жанчын. Пры актыўным удзеле жанчын прайшлі выбары ва Убалацкім сельсовеце (Клічаў), дзе яўка жанчын складала 92,6 проц., а колькасць абраных жанчын у склад сельсовета раўняецца 35 проц. Тое-ж самае па Усакінскаму сельсовету. З'явілася на выбары—95,9 проц., абрана ў склад сельсовета 30 проц. жанчын. У Бацэвіцкім сельсовеце абрана 36,6 проц.

Па раёну абрана—3 жанчыны старшынямі сельсоветаў і 10 намеснікамі старшынь. Адна з іх, Штэйнберг Эльза, з'яўляецца лепшай ударніцай-калгасніцай, якая тры гады працавала загадчыкам малочна-таварнай фермы, у калгасе з 1929 года, зараз абрана старшынёй Усакінскага сельсовета.

Вылучэнне жанчын на адказную пасаду яшчэ больш актывізуе выбаршчыц, уцягвае іх у грамадскую работу. Зараз выбары праходзяць пры актыўным удзеле працоўных жанчын. Прыкладам можа служыць тое, што ў часе справаздачнай кампаніі ў вёсцы Кокатава, па ініцыятыве жанчын арганізован калгас, у які ўвайшлі ўсе жыхары гэтай вёскі ў колькасці 14 гаспадарак. Старшынёй калгаса абрана жанчына **Ждановіч А.**

М. Ючкова.

Клічаўскі р.

Новы прыліў у калгасы

Перавыбарчая кампанія органаў пролетарскай дыктатуры—Советаў—узняла новы магутны прыліў у калгасы ў Глускім раёне.

У некаторых калгасах, Хваставіцкага сельсовета, лепшыя калгаснікі-ўдарнікі расказваюць аднаасобнікам наколькі палепшыліся іх умовы ў калгасах. Гэты прыклад з'яўляецца лепшай агітацыяй за калгасы.

Былая аднаасобніца вёскі Багданава—Бульковіч Алена ў часе перавыбараў советаў заявіла:

— Я толькі сёння зразумела, што ў калгасе я сапраўды палепшу сваё жыццё. Я—удава, маю дзіцё і павінна ісці адзіна-правільным шляхам, каб не туманіць вочы дзіцяці. Яшчэ сотні аднаасобнікаў пераканаліся ў правільнасці калгаснага шляху.

На 22 лістапада па Глускаму раёну арганізавана 5 калгасаў, у якія ўступіла 384 гаспадаркі. Дзесяткі гаспадарак уступіла і ўступае ва ўжо існуючыя калгасы. У калгас „Чырвоная арэса" ўступіла 15 гаспадарак, у калгас „Клім Варашылаў"—17 гаспадарак, у калгас „Шлях да соцыялізму"—12 гаспадарак, у калгас „Чырвоны Воін"—7 гаспадарак і т. д.

А. У.

НА ВЫБАРАХ СЕННІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА

На выбарчы ўчастак, у клуб соўгаса „Сенніцы", Сенніцкага сельсовета, выбаршчыкі прышлі арганізавана, пад музыку, са сцягамі. Гэтаму выбарчаму ўчастку ёсць чым ганарыцца. Тут кожны відавочна бачыць праробленую работу сельсовета.

Ёсць школа-сямігодка, хата-лабараторыя, радыё-аўдыторыя, гурткі па вывучэнню марксізма-ленінізма для калгаснікаў.

Вельмі сур'ёзна аднесліся калгаснікі да выбараў. Кожная кандыдатура абгаварвалася паасобку. Калі назвалі прозвішча Ярашэвіч з калгаса „Чырвоны спецыяліст", пачуліся запытанні ад тых, хто яе не ведае.

— Ударніца яна? Як удзельнічае ў грамадскай рабоце?

Слова ўзяў парторг калгаса „Чырвоны спецыяліст".

— Тав. Ярашэвіч—прэміраваная ўдарніца калгаса. За дзевяць месяцаў выпрацавала 260 працадзён, актывістка, комсамолка, былая бяднячка.

Безліч рук паднялася ўгару—Ярашэвіч абрана аднагалосна.

За Ярашэвіч прайшлі кандыдатуры настаўніцы **Марозавай**—актывісткі, комсамолкі. **Сквірнюк Алены**—работніцы соўгаса „Сенніцы"—прэміраванай ударніцы. **Кашыкавай Надзі, Лішай Гэлькі і іншых.**

У наказ новаабранаму сельсовету, калгасніцы ўнеслі многа дадаткаў.

— Замацаваць на круглы год яслі. Палепшыць гарачае снеданне вучняў. Радыёфікаваць хаты калгаснікаў. Больш чула адносіцца да запатрабаванняў працоўных.

У выніку праведзенай вялікай растлумачальнай работы з 37 абраных членаў сельсовета выбрана 13 жанчын. Усе яны прэміраваныя ўдарнікі і ўдарніцы соцыялістычных палёў.

А. Б.

Мекскі раён.

А. МАНЬКОУ.

Рабочым, работніцам ф-кі „Герой працы" прысвячаю.

ПЛАВІЛЬНАЯ ПЕЧ*)

(Апавяданне)

Праскоўя Міхайлаўна сёння прачнулася яшчэ задоўга да ўсхода сонца. Даўно не была на фабрыцы. За дзве гадзіны да першага гудка яна прышла ў свой цэх, праверыла свой інструментальны шафік, прывяла ўсё ў парадак і вышла на фабрычны двор. Радаснай усмешкай спаткаў яе інжынер з аддзела капітальнага будаўніцтва — Абрам Майсеевіч Штэрн

— А-а, прыехалі. Дужа добра... Віншую з перамогай...

— Ды што вы, напэўна, жартуеце.

— Як жартую. Уся фабрыка грыміць аб вашай рабоце на торфазаводзе. Фабрычная газета старонку вам прысвяціла...

— Годзе аб гэтым Абрам Майсеевіч. А то чаго добрага галава ў нас пачне кружыцца ад поспехаў, ха-ха. Раскажэце лепш, што на фабрыцы чуваць, даўно не была, засумавала.

— Няма чым пахваліцца. Працуем напалову. Другая плавільная печ стаіць ужо трэці тыдзень, першая таксама на чарзе. Няма талькавай цэглы. А з простай цэглы плавілку не злепіш, вось і стаяць асобныя механізмы. Шчолакаў таксама не хапае...

— Ну, а што фабрычныя арганізацыі?

— Шавеляцца. Дзярноў у Маскве цэлы тыдзень сядзіць.

— Ну, а грамадскасць?

— Ну вядома што: хвалюецца, крытыкуе на сходах кіраўнікоў. А яны абяцаюць і толькі...

— А які цэх за рамонт адказвае?

— Ваш, Праскоўя Міхайлаўна, механічны. У вас цяпер новае начальства, мабыць, чулі.

— Крыху, чула. Але раскажыце падрабязней...

— Навошта гаварыць, самі ўбачыце. Не толькі ў вас новае начальства, у аддзеле снабжэння, на сілавой, у аддзеле кадраў... Нядаўна прыехаў новы механік і прывёз з сабой адзінаццаць слесароў. Усе яны адтуль, адкуль дырэктар прыехаў—знаёмыя яго.

— Так, навін шмат!

Праскоўя Міхайлаўна па інтанацыі пазнала, што стары інжынер хвалюецца і чымсьці незадаволены. Ён патаптаўся крыху на месцы, нібы робячы разбежку для хуткай хады, і потым, неўдала ўсміхнуўшыся, адказаў:

— Ну, бывайце... Пажывем—убачым... Я пайшоў...

Праскоўя крыху пастаяла, паглядзела на адыходзячую постаць інжынера, а потым крута павярнула і пайшла ў папяровы цэх.

У цэху яе спаткалі рабочыя, работніцы апошняй і першай змены крыкамі:

— Здарова, Пашка!

— Пераможцу на фронце торфаздабычы шчырае большэвіцкае прывітанне!

— Ды што вы, таварышы, я гэтага не заслужыла..

— Кінь, Пашка, сароміцца!

— Малайчына, Пашка, уцёрла нос уціны, чулі мы. А то ў яго шастом галавы дастаць нельга было.

— Ну, як, таварышы, жывем?

— А так, дзень працуем, а два сядзім,—за ўсіх адказаў сетачнік Ванька Куркевіч. Шостая і чацвёртая тры дні стаяць, няма матэрыялу, не хапае шчолакаў. Шчолаку ў чыгунах не зварыш, а плавілка раскідана. Талькавай цэглы няма і вінавата таксама няма...

— А нашага заработку пяцьдзесят процантаў расстала, як вясной апошні лёд,—сказала накатчыца Ліда.

— А план ты выконваеш?—засмяяўся Іван Куркевіч.

— А хіба-ж яна вінавата ў невыкананні? — падтрымаў Ліду рольшчык Пархвен Драздоў,—давай матэрыял, дык будзе і план. З пяску паперы не злепіш. Нутро баліць, Праскоўя Міхайлаўна, за фабрыку... Паверце...

— Хіба-ж я не веру, Пархвен Сцяпанавіч. Будзем агульнымі сіламі змагацца за план, за ліквідацыю недахопаў.

Гудзеў паўторны гудок. Павольна раскачваліся машыны. Шыпелі сушыльныя прэсы, лязгаталі пасы шматлікіх трансмісій. Пульс фабрыкі біўся як у хворага чалавека.

V.

Так прамільгнуў рабочы дзень. Увечары засядала бюро парткалектыва. На павестцы дня стаялі два пытанні: справаздача брыгады, ездзіўшай на торфазавод, і аб плавільнай печы.

Першае слова атрымаў Сымон Уткін. Ён шмат гаварыў пра тое, якое значэнне мае торфазавод, як апалавая база фабрыкі. Потым гаварыў аб прычынах прарыва.

— Мы мабілізавалі актыў, увесь рабочы калектыў, ачысцілі завод ад чужакоў і справа пайшла наперад...

— А што гэта за спрэчкі і разыходжанні былі з Маеўскай?—перабіў яго сакратар комсамольскага калектыва Бярозкіна Клава.

— Я быў супроць перагрузкі машын. Праскоўя Міхайлаўна не хацела зразумець таго, што ад празмернай перагрузкі і караблі ідуць на дно...

— Машына каштуе тысячы, а прастой фабрыкі абыходзіцца дзяржаве мільёны страт,—кінула Праскоўя Міхайлаўна.

Уткін маўчаў. Ён крута павярнуў пад сябе крэсла і сеў побач з Галяй Любімавай. На вуха шаптаў ёй:

— Як твая думка?

— От, наскочыла каса на камень... Грызецеся чорт ведае завошта, нібы не падзялілі чаго.

Слова далі Праскоўі. Яна трахнула завітушкамі светла русых валос і крыху хвалюючыся пачала:

Вывучаў Уткін тэхнічную магчымасць элеватараў, а брыгады ні аднэй з прарыва не вывеў. Галя, слухаючы яго, таксама тапталася на месцы вакол трынацаці тысяч цэглаў. Брыгады ірваліся наперад. Уткін іх стрымліваў. Машын шкадаваў... Таварышы, мне таксама яны дарагі, але-ж шкадуючы машыну трэба выкарыстаць поўнасцю і яе тэхнічную магутнасць. А на заводзе нормы былі ўстаноўлены апартуністычныя...

Выступленне Праскоўі было падтрымана большасцю бюро.

Аб плавільнай печы доўга не гаварылі. Ды што гаварыць, калі не было талькавай цэглы. Усе

*) Пачатак гл. у № 21 нашага журнала.

ведалі, што дырэктар Дзярноў сядзіць у Маскве, штурхае там справу. У пастанове запісалі: „прыступіць да рамонта, як толькі прыдзе цэгла"...

Потым абмяркоўвалі рознае. Дырэкцыя прасіла вылучыць чалавека на пасаду начальніка аддзела капітальнага будаўніцтва. Пасада адказная... Трэба было абмеркаваць кандыдатуру.

Мінут пяць бюро маўчала. Кожная мінута здавалася надзвычай доўгай. Нарэшце падымаецца высокая постаць брыгадзіра будаўнічай брыгады Сінічкіна.

— Без малага працую я на вытворчасці трыццаць гадкоў. Не люблю я словы на вецер пушчаць...

— Давай, давай, Сінічкін,—падтрымоўвалі яго.

— На гэту пасаду Праскоўю Міхайлаўну прапаную вылучыць. Не падвядзе, справіцца...

— Правільна!—чуліся галасы.

— Ды што вы, таварышы, выбірайце другога,—хвалюючыся сказала Праскоўя.

— Галасуем!..

Супроць не было. Нават Уткін высока падняў руку, каб Праскоўя бачыла, што ён ёй не вораг.

А праз пару дзён за кандыдатуру Праскоўі галасаваў партыйны калектыў з пяцісот чалавек. Потым загад дырэктара і Праскоўя пайшла знаёміцца з абавязкамі сваёй пасады. Знаёміў яе Абрам Майсеевіч.

Спадзявалася Праскоўя атрымаць дапамогу ад партыйнага і комсамольскага калектываў. Верыла, што сустрэне на новай рабоце новых Арцёмавых і павядзе іх у бой за планы капітальнага будаўніцтва, а выходзіла зусім другое.

Уткін замяняў у гэты час сакратара парткома. Яму хацелася чамусьці пагутарыць з Праскоўяй, каб ніхто не бачыў.

І вось аднойчы, спаткаўшы яе ў парку, ён прапанаваў прайсціся за рэчку. Праскоўя пайшла. Яна думала, што Уткін будзе гаварыць з ёй, як сакратар. Прайшлі праз мост. Уткін маўчаў, толькі неяк цяжка ўздыхаў, нібы нечага шкадуючы.

— Ты што, Сенька, так цяжка ўздыхаеш?—парушыла маўчанне Праскоўя.

— Цяжка, Пашка, вось і ўздыхаю.

І яны моўчкі звярнулі налева і пайшлі ўздоўж рэчкі. На румах ляжала бярвенне. Тут яны прыселі. Узнята і пяшчотна гаварыў Уткін. Блізасць Праскоўінага цела п'яніла яму галаву. Ён нечакана абняў яе і з сілай дзікага звера пачаў цалаваць.

Праскоўя крыкнула і ледзь вырвалася з яго абдымкаў.

— Пашка... Люблю я цябе...— шаптаў ёй услед Уткін.

. . . . . .

Прайшло шмат часу ад гэтага здарэння. Праскоўя доўга думала, што магло прымусіць Уткіна злосць змяніць на любоў да яе. Яна рашыла лепш не думаць аб гэтым. Яе думкі перанесліся на фабрыку. Тут перад ёю паўставала шмат непарадкаў.

— Набіраюць на фабрыку новых людзей проста з вуліцы, не пытаюць нават дакументаў. Запісваюць іх у кнігу, выдаюць прапускі. Па цэхах у часе работы ходзяць незнаёмыя людзі, чагосці прыглядаюцца.

На фабрыцы павялічыліся аварыі. У нажах рубільнага патрона знайшлі кавалкі жалеза. На сілавой чацвёрты кацёл узарваўся, добра што хоць без чалавечых ахвяр справа абыйшлася. Пасля аварыі на сілавой былі ўзарваны фланцы ў варачным катле, і тоны цёмна-бурай масы залілі варачнае аддзяленне. Ролы шостай машыны не працавалі. Яны былі папсаваны класавым ворагам.

— Не! Далей гэтага цярпець нельга, — рашыла Праскоўя, — трэба змагацца...

(Працяг будзе).

С. М. Богуш.

ХАНА ЦЫЎЛІНА

У Ханы Цыўлінай дужа цікавы і разам з тым досыць багаты жыццёвы шлях, якім яна ўправе ганарыцца.

Зараз Хана камандзір цэха. З года ў год яе цэх з'яўляецца ўзорам для ўсёй фабрыкі па ўсім паказчыкам выканання промфінплана.—Вось ужо трэці год,— кажа дырэктар фабрыкі,—як цэх Ханы Цыўлінай ніжэй 105 проц. плана не дае. Калі-б усе былі такімі работнікамі, як Цыўліна, мы-б паказалі што значыць працаваць!..

Але такіх паказчыкаў дабіваюцца не адразу. Шмат давялося Хане працаваць над сабою, на розных работах, пакуль яна зрабілася начальнікам цэха і героем першай пяцігодкі.

8-мігадовай дзяўчынкай пайшла Хана працаваць па найму. З першых часоў працавала Хана чорнарабочай на скураным заводзе ў мястэчку Добранка. Потым працавала сцельшчыцай на торфазаводзе. І так з года ў год аж да 1920 года.

У 1920 годзе застагнала мястэчка Добранка, як і ўся Беларусь, ад выбухаў варожых снарадаў. Разгарэлася полымя вайны з белапалякамі. Моцна ахапіў мястэчка Добранку бандыцкі разгул. Людзі беглі, ратуючы сваё жыццё, з запаленага мястэчка. Разам з усёй сям'ёй пакінула Добранку і Хана, накіроўваючыся разам з усімі ўцекачамі ў Гомель.

У 1925 годзе Хана Цыўліна працуе ў шчотачнай арцелі, потым на цвіковым заводзе. У 1928 годзе яна паступае вучыцца на панчошную фабрыку імя 8-га сакавіка ў Гомелі. І тут Хана ўбачыла сапраўднае жыццё, радаснае і кіпучае. Незвычна спачатку было Хане сябраваць з варштатамі ды машынамі. Але вялікае жаданне набыць кваліфікацыю, жаданне стаць кваліфікаванай работніцай, перамагло.

Хана Цыўліна.

Хана добра аўладала варштатамі і пачала працаваць самастойна.

У гэты-ж самы час Хана ўступае ў рады слаўнай комуністычнай партыі.

Такі шлях Ханы Цыўлінай, мястачковай, закінутай дзяўчынкі, чорнарабочай, а зараз лепшага начальніка цэха, рацыяналізатара і вынаходніка. За ўвесь час сваёй работы на фабрыцы, Хана паказала сябе вытрыманай большэвічкай, загартаванай партыяй і прыкладнай ва ўсіх адносінах. А такіх, як Хана, на нашых фабрыках сотні і тысячы... І аб іх павінна ведаць наша краіна.

ЗМЯНШАЕЦЦА ЗАРАБОТАК, БЕСПРАЦОЎЕ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

(ОСЛО, НОРВЕГІЯ)

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Эсперанцкі клуб „Пролетарый“ у Осло, сярод якіх знаходзіцца многа работніц, шле вам палкае пролетарскае прывітанне.

У Норвегіі, як і ў іншых капіталістычных краінах, пануе крызіс, які цяжка адбіваецца на жыцці рабочых і работніц. Зменшыўся наш заработак. Беспрацоўе ў нашай краіне павялічваецца. Цяпер у Норвегіі ёсць каля двухсот тысяч беспрацоўных, у большасці сямейных. Можна сабе ўявіць іхняе жыццё.

Работніцы шмат церпяць з-за нізкай зарплаты і непасільнай працы. За адну і тую-ж цяжкую работу работніца атрымлівае менш за рабочага.

Фашызм імкнецца ўцягнуць у свае рады работніц прыгожымі фразамі аб сям'і і шчасці. Але многія работніцы пачынаюць разумець гэта і змагаюцца плячо ў плячо з рабочым мужчынай супроць фашызма.

Мы, эсперантысткі, стараемся растлумачыць работніцам нашай краіны аб вашым жыцці ў Совецкім Саюзе, аб адзінай краіне ва ўсім свеце, дзе работніцы ва ўсім прыраўнены да рабочага.

Але мы таксама маем некаторыя поспехі. Нашы работніцы пачалі разумець, што адзіны шлях да іх вызвалення ад фашызма, гэта—шлях Леніна. Мы спадзяемся, што мы, норвежскія работніцы, выканаем свае гістарычныя абавязкі.

Няхай жыве Совецкі Саюз!

Няхай жыве сусветны Чырвоны Кастрычнік!

З палкім прывітаннем ад імя работніц пролетарскага клуба *СІГРЭН*

Мы рады, што вы зразумелі ленінскія заветы

(Адказ норвежскім работніцам)

Мы, работніцы зборачнага цэха завода „Ланцугоў Галля“ (Менск), прачыталі ваша пісьмо. Ваша цяжкае жыццё ў капіталістычнай Норвегіі выклікае ў нас абурэнне супроць усіх эксплаататараў рабочага класа, бо мы ведаем, што так жывуць усе нашы сёстры па класу ў капіталістычных краінах.

Зусім іншае становішча ў нас у СССР—бацькаўшчыне сусветнага пролетарыята. Беспрацоўе тут зусім ліквідавана. Работніца мае тыя-ж правы што і рабочы ў вытворчасці і ў палітычным жыцці краіны.

Наш завод мае ўсесаюзнае значэнне. Мы выпрацоўваем ланцугі для сельскагаспадарчых машын і велісапедаў. У нас працуе 50 проц. жанчын. Яны займаюць такое-ж становішча ў вытворчасці як і мужчыны. Жанчыны працуюць на кваліфікаваных работах і атрымоўваюць такую-ж зарплату як і рабочыя.

Сярод нас ёсць многа работніц, якія прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці завода. Напрыклад **Надзя Дзігілёнак** профарганізатар цэха, лепшая ўдарніца—зотаўка. („ЗОТ“ гэта значыць—за аўладанне тэхнікай). Тыя рабочыя і работніцы, якія здаюць тэхнічны экзамен на „выдатна“, атрымоўваюць значок „ЗОТ“ і завуць іх зотаўцамі. З 8 зотаўцаў нашага цэха—6 жанчын.

Мы працуем 7 гадзін у дзень, а жанчыны, якія маюць грудных дзяцей, працуюць 6 гадзін. Падросткі да 18 год працуюць 4—6 гадзін. Астатні вольны час мы скарыстоўваем для павышэння сваіх ведаў, і для культурнага адпачынку. Займаемся мы ў школах, часта ходзім у тэатр, кіно і ў клубы.

Наша дырэкцыя, партыйныя і профсаюзныя арганізацыі завода вельмі клапоцяцца аб палепшанні нашага быта. У парадку падрыхтоўкі да зімы завод адрамантаваў кватэры нашых ударніц за кошт завода. Мы маем сталовую, у якой ёсць таксама і дыэтычныя абеды і абеды для ўдарнікаў.

На час работы і вучобы мы пакідаем нашых дзяцей у яслях і дзіцячых садах. Там яны добра накормлены і знаходзяцца пад наглядам вопытных кіраўнікоў.

Цяпер у нас праводзіцца справаздачна-перавыбарчая кампанія горсовета. Гэта для нас вялікае свята, бо мы абірам сваіх-жа рабочых і работніц у гарадскі совет—орган дыктатуры пролетарыята. Толькі ў нас у СССР працоўная жанчына мае аднолькавыя з мужчынай правы выбіраць у советы і быць абранай.

У парадку падрыхтоўкі да выбараў у советы мы ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па датэрміноваму выкананню промфінплана на лістапад месяц, па палепшанню якасці нашай прадукцыі. Свае абавязацельствы мы выконваем.

Нам вельмі радасна, што вашы работніцы пачалі разумець значэнне ленінскіх заветаў, што яны змагаюцца супроць капіталізма, супроць фашызма.

Мы спадзяемся, што наша сувязь узмацніцца, што вы ў далейшым будзеце нам пісаць аб вашым жыцці і барацьбе.

Жадаем вам далейшых поспехаў па арганізацыі работніц і працоўных жанчын Норвегіі пад сцягам Комінтэрна на барацьбу супроць фашызма.

Па даручэнню агульнага сходу работніц падпісалі лепшыя ўдарніцы: Дзігілёнак, Бацвінік, Шульдзінер, Капялевіч, Альперовіч, Бэсер, Лашк, Пастушонак, Рашкевіч, Кукарэка, Гарбаценка, Балотнікава.

Зотаўкі зборачнага цэха завода „Ланцугоў Галля“, якія падпісваюць пісьмо.

За права рапарта VII з'езду советаў

Разгортванне паходу імя з'ездаў советаў—барацьба за права рапарта з'езду советаў, за права атрымання месца ў чырвонай кнізе БССР ператварылася ў вялікую палітычную кампанію. Мы абавязаны гэтую кампанію скарыстаць для таго, каб зрабіць яшчэ адзін крок уперад у справе індустрыялізацыі нашай краіны.

Барысаўская запалкавая фабрыка „Пролетарская перамога" ўключыўшыся ў вытворчы паход з'ездаў советаў, у першую чаргу звярнула асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку кваліфікаванай сілы і падбор кіруючых работнікаў у цэхах. Разгарнулася соцспаборніцтва паміж цэхамі і брыгадамі за чысты і культурны цэх, за датэрміновае выкананне вытворчай праграмы.

Зараз у экаціровачным цэху, дзе майстрам працуе тав. Шапчыц Надзя і парторг Жаркевіч—узорная чыстата. Цэх абстаўлен кветкамі і вазонамі, упрыгожан партрэтамі правадыроў і лозунгамі. Каля машын мільгацяць на чырвоных палотнах надпісы: „за вышэйшыя паказчыкі".

Аб сабе тав. Шапчыц расказвае:

— На працягу 11 год я на гэтай фабрыцы значна выросла. Тут мае сёстры таксама раслі. У 1933 годзе мяне, як старую кваліфікаваную работніцу, назначылі майстрам змены. Змена, якую мне даручылі, была самай адсталай, а зараз, уключыўшыся ў вытворчы паход імя з'ездаў советаў, мы вышлі ў перадавыя. 24 лістапада скончылі гадавую праграму. Брак зніжан на 0,7 проц. Згодна дапускаемых па плану 4,5 проц., маем фактычна 3,7 проц.

Тав. Шапчыц дабілася добрага рэзультата дзякуючы шырока разгорнутаму соцспаборніцтву і масавай тэхвучобы. У яе змене налічваецца 130 чалавек рабочых, якія ахоплены тэхвучобай. З гэтага ліку зотаўцаў-значкістаў 70 чалавек і 30 чалавек, якія здалі тэхэкзамен на „добра". Спаборніцтва заключана паміж брыгадамі і цэхамі. Брыгада тав. Левінай спаборнічае з брыгадай тав. Нехамінай. Адначасова змена яе цэха спаборнічае са здымальным цэхам.

Але тав. Шапчыц на дасягнутым не спыняецца. Яна шмат працуе над сабой, наведвае партвучобу, тэхвучобу і агульна-адукацыйную школу.

Здымальны цэх, з якім спаборнічае Надзя, не ўступае ёй. Здымальны цэх выконвае план на 115,7 проц. Таксама 25 лістапада скончыў гадавую праграму. Усе рабочыя ахоплены тэхвучобай. З агульнага ліку рабочых—95 чалавек зотаўцаў-значкістаў налічваецца 70 чалавек.

Патаповіч Настася—майстар здымальнага цэха мае 27-гадовы вытворчы стаж. За гэты час яна набыла вялікі вопыт вытворчай работы. Яна практычна вучыць работніц, як працаваць на той ці іншай машыне. Характэрны факт, калі работніцы Стасевіч і Латушка не выконвалі план, тав. Патаповіч узяла над імі шэфства і зараз гэтыя работніцы з'яўляюцца лепшымі ўдарніцамі.

Фабрыка „Пролетарская перамога выкавала не толькі Шапчыц, і Патаповіч, іх можна пералічыць вельмі многа—гэтых здольных гаспадарчых і партыйных работнікаў, дзякуючы якім фабрыка з гонарам спраўляецца з пастаўленымі задачамі. Аб гэтым сведчаць наступныя лічбы. Вытворчая праграма за 9 месяцаў выканана на 104,7 проц., у тым ліку за першы квартал на 103 проц., за другі—на 107, за трэці—на 106,3 %. Прадукцыйнасць працы за 9 месяцаў складае 104,9 проц., брак зніжан за трэці квартал па аўтаматычнаму цэху да 6,15 проц. (па плану—7 проц.), зборачны цэх па запалкам—1,86 проц. (па плану—2), па каробкам—1 проц. (па плану—2 проц.). Фабрыка 25 лістапада скончыла гадавую праграму і занесена кандыдатам на чырвоную дошку гонара.

Усё гэта дасягнута дзякуючы правільнаму падбору кіруючых работнікаў, добра арганізаванай тэхвучобе, якая дала ф-цы 862 зотаўца, дзякуючы шырока разгорнутаму соцспаборніцтву і ўдарніцтву, правільнай пастаноўцы партмасавай работы. У гэтым вялізарная заслуга кіраўніцтва фабрыкі.

Не малую ролю адыгрывае і фабрычны друк, які на сваіх старонках змагаецца за ўшчыльненне рабочага дня, за якасць прадукцыі, за моцную дысцыпліну, перадаючы вопыт перадавых цэхаў.

Дасягненні фабрыкі „Пролетарская перамога" ствараюць усе ўмовы для атрымання права на рапарт VII усесаюзнаму і XI усебеларускаму з'езду советаў. Рабочы калектыў павінен гэтага дабіцца.

Б. Лявіцкая.

Галя Кедо—зотаўка завода імя Варашылава

Васіль Ксендзоў.

ШАЛЯСЦЯЦЬ, ГАМОНЯЦЬ...

Шалясцяць, гамоняць
За вакном таполі,
Шалясцяць пад вечар
Шызым лістам.
Дзесьці недалёка
Гэту ціш ваколіц
Абудзіў вясковы
Гарманісты.
Абудзіў і сэрца
У сваёй каханай,
Пералівам тонаў
Галасістых.
Толькі сёння, штосьці
Гэты тон баяна
Рассыпае смутак
Бель—маністы.
Па-другому шкваляць
Думкі у дзяўчыны.
Адплылі вячоркі
Шляхам кружным.
І тугу, і радасць
У адно злучыла
З комсамольскай песняй
З працай дружнай.
Хай гармонік грае
Галасістым тонам—
Не ўстрывожыць сэрца
Гэткім ладам.
Сёння—сход ячэйкі,
Заўтра—палітшкола.
Паспяшыць усюды
Трэ' з дакладам.
Вось чаму дзяўчына
З радасцю сваволіць,
А ў думках сніцца
Край квяцісты...
Шалясцяць, гамоняць
За вакном таполі,
Шалясцяць пад вечар
Шызым лістам.

г. Менск.

ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ЗОТАЎЦАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Заводы імя Варашылава і „Комунар"—да злёту

Некалькі месяцаў таму назад рэдакцыя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі" праводзіла рэйд па пяці прадпрыемствах цяжкай прамысловасці БССР.

Брыгады рабкорак на заводах імя Варашылава, „Комунар", „Ударнік" (Менск), Гомсельмаш, і „Пралетарый" (Гомель) правяралі выкананне загада наркамцяжпрома СССР тав. Орджонікідзе аб працы жанчын у цяжкай прамысловасці.

Вынікі рэйда абгаварваліся ў упаўнаважанага Наркамцяжпрома СССР па БССР, пасля чаго ўпаўнаважаным быў дадзен загад, які абавязваў дырэктароў заводаў уцягнуць больш работніц у тэхвучобу, вылучыць лепшых зотавак на вышэйшыя разрады і палепшыць іх бытавыя ўмовы.

У парадку падрыхтоўкі да ўсебеларускага злёта зотаўцаў цяжкай прамысловасці БССР, мы праверылі на заводах імя Варашылава і „Комунар", як выконваецца гэты загад.

Праверка паказала, што на заводзе імя Варашылава пасля праведзенага рэйда палепшылася справа тэхвучобы работніц.

Напрыклад, у ліцейным цэху раней тэхвучобы зусім не было. Пасля праведзенага рэйда разгарнулася вучоба і падрыхтоўка да тэхэкзаменаў. Усе чатыры работніцы-шышэльніцы, якія працуюць у ліцейным цэху, здалі тэхнічны экзамен на значок „ЗОТ" і былі пераведзены на вышэйшыя разрады.

Адна зотаўка гэтага цэха т. Кочарава цяпер абрана на ўсебеларускі злёт зотаўцаў.

У механічна-зборачным цэху зотаўка тав. Ефімава рыхтуе 6 чалавек для здачы тэхэкзамена на значок „ЗОТ". Сярод іх—работніцы Лашкевіч і Кішчыцер.

Зотаўка—токар Галя Кедо, з першага лістапада, вылучана на лепшы варштат, ёй даручаюць больш складаную работу. З гэтай работай яна вельмі добра спраўляецца. Промфінплан перавыконвае, брака зусім не ведае. За першыя дзесяць дзён лістапада на новым варштаце Галя за 70 гадзін зрабіла работу, на якую трэба патраціць 170 гадзін. Недарма Галю аднагалосна абралі дэлегатам на ўсебеларускі злёт зотаўцаў.

У матэрыяле рэйда мы таксама ўказалі на неабходнасць правядзення рамонта ў інтэрнаце. Цяпер інтэрнат адрамантаваны і абсталяваны.

Але побач з дасягненнямі ў тэхвучобе работніц і палепшанні быта, мы яшчэ маем на заводзе недапушчальныя адносіны адміністрацыі да вылучэння лепшых зотавак на вышэйшыя разрады. Мы пісалі ўжо ў матэрыялах рэйда аб агідным факце, што лепшая зотаўка механічна-зборачнага цэха тав. Ефімава працуе на другім разрадзе. Але і да гэтага часу яна яшчэ працуе на тым самым разрадзе, не гледзячы на яе заявы цэхавай адміністрацыі.

На заводзе „Комунар" лепш абстаіць справа з вылучэннем работніц на вышэйшыя разрады. Работніцу Дунэр перавялі з чацвертага на пяты разрад, Малчанаву—з інструментальшчыцы перавялі на слесара, тав. Акуценка вылучана брыгадзірам брыгады тачыльнага цэха. Былую кур'ершу Войткаву перавялі на такарны варштат. Чатырох прыбіральшчыц — Дзядзюлю, Міцкевіч, Бурбоўскую, Арыніч—вылучылі на работу ў якасці токараў. Былая жонка рабочага Гомельская, зараз працуе на заводзе токарам і не горш за свайго мужа спраўляецца з работай.

Але на заводзе дрэнна пастаўлена тэхвучоба. Аб гэтым сведчыць той факт, што на заводзе ўсяго адна работніца-зотаўка. Гэта сорам для завода „Комунар". Праўда, у часе падрыхтоўкі да ўсебеларускага злёта „ЗОТ", крыху разгарнулася масавая тэхвучоба сярод работніц, але ўсё-ж работніц зотавак толькі адна.

Тав. Маўчанава—ударніца завода „Комунар".

Адсутнасць работніц-зотавак на заводзе—гэта адсутнасць масава-растлумачальнай работы сярод работніц аб аўладанні тэхнікай.

Дырэктар завода тав. Драбышэўскі шмат зрабіў у справе перавода жанчын на вышэйшыя разрады, вылучэнне прыбіральшчыц на кваліфікаваную работу, у справе рамонта інтэрнатаў і кватэр рабочых, пасылцы на курорт работніц, але чамусьці тав. Драбышэўскі мала звяртае ўвагі на той факт, што на яго заводзе толькі адна выдатніца.

Нельга таксама не адзначыць недастатковую класавую пільнасць на заводзе. У часе рэйда наша брыгада выявіла, што ў фрэзернага варштата працуе нейкая Стэфановіч, муж якой раскулачан і выслан, у той час, калі старыя работніцы працуюць на чорнай рабоце.

Другі прыклад. Вылучаюць на работу ў якасці токара афіцыянтку Каханоўскую—дачку кулака, які раскулачан і выслан.

Прыведзеныя факты абавязваюць трохкутнік завода больш узмацніць класавую пільнасць, бо недабіты класавы вораг імкнецца пралезці на ўсе ўчасткі соцыялістычнага будаўніцтва.

Дырэкцыя завода „Комунар" павінна сур'ёзна ўзяцца за справу ўцягнення ўсіх работніц у тэхвучобу, павялічыць рады выдатніц-зотавак. Загад тав. Орджонікідзе і ўпаўнаважанага Наркамцяжпрома павінен стаць штодзённым кіраўніцтвам у рабоце дырэкцый заводаў.

Е. Эпштэйн.
Менск. **Б. Лявіцкая.**

„... Самае важнае з пункту гледжання будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму".

(СТАЛІН).

Віктар КАЗЛОЎСКІ

Тры таварышкі*)

(Апавяданне)

Зялёныя, сінія, чырвоныя кругі замітусіліся ў Настасіных вачах. Ледзь перастаўляючы ногі, сагнуўшыся, цяжка ступае Настася па гразкай дарозе. На плячах у яе мяшок бульбы. Яна зманая спыняецца. Яе самлелыя рукі аслабяваюць, мяшок выслізваецца і апускаецца на зямлю. Настася глыбока ўдыхнула паветра і села на мяшок. Яе апырсканыя босыя ногі нерухома прыстылі да гразі. Нахіленая галава не знаходзіць роўнавагі: то прыўзнімаецца, то апускаецца. Плойкі чарнявых валасоў высыпаюцца з-пад хусткі і падаюць на заружавелыя пухлявыя шчокі. У яе карых вачах, здавалася, адсвечвалася нейкая глыбокая задумёнасць. Але не... Нічога-б яна не адказала, каб запыталі пра што думае. І сама ўцяміць не можа. А ні аднэй думкі не ўловіць. Яны адна за адной, як маланкі мільгацяць, мітусяцца, мяшаюцца, блытаюцца. Тысячы дум—і ні адной... Нарэшце, паволі перад ёй вырысоўваецца вобраз Мікалая. Ён такі стройны, у чорнай сацінавай рубашцы, у сініх галіфэ стаіць перад ёй, паклаўшы рукі ёй на плечы. Шапка пад пахай чорная прычоска, зграбна ўзнімаецца ўверх над пукатым ілбом. Густыя бровы паўмесяцамі ўзыходзяць над яснымі зорамі вачэй ягоных. Ён стаіць з момант маўкліва і глядзіць ёй у вочы. Нарэшце; развітваецца: Бывай, Настася, з арміі вярнуся, жыць разам будзем."

І вось надышла другая восень. Цэлы год не бачыла яна Мікалая. Што-б ён сказаў, каб убачыў яе ў такім выглядзе. Напэўне-б зняслюбіў. На сабе мяшкі, як конь той, цягае, а ў калгас не пайшла. Не паслухалася яго. А казаў-жа—„сцежкі нашы ў калгасе сыйдуцца. Э аднаасобніцай жаніцца не да твару".

Упоперак калгасных палёў, пафыркваючы, утоптваючы мяккую сырую зямлю, на дарогу выходзіў „эшалон". Трактар цягнуў шэсць прычэпленых адзін да аднаго, нагружаных бульбай вазоў. Такі састаў калгаснікі празвалі „эшалонам". На апошнім возе, у „эшалоне" сядзела з кашом у руках Домна. Яна жартаўліва пакрыквала на трактарыста: „Эй, машыніст! Семафор адкрыты, давай пары! А калі на калдобіне падскочыў воз, вылецела лёстка і пасыпалася бульба, яна закрычала: „Крушэнне... Тармазі"! Трактар спыняўся, трактарыст з Домнай збіралі бульбу, устаўлялі лёстку і папраўлялі палукашак.

Настася здзіўлёна, з захапленнем глядзела на „эшалон", які неўзабаве набліжаўся да яе. Яна адчувала непераможнасць гэтай грузнай машыннай сілы, якая непакорна рушылася, расцірала людское гора, індывідуалізм, уласнасць, якая вызваляла з-пад цяжару працы, несла хвіліны радаснага адпачынку.

Мінаючы аднаасобніцкія падводы, Домна крычала на дзядзьку Тодара: „Эй, набок, Федзя, калгас едзе"! Максім скоса зірнуў на сваю былую жонку, кпліва ўсміхнуўся і сарамліва вочы яго разбегліся па вазах, па калеінах, па полі.

Параўняўшыся з Настасяй, Домна жартавала: „Садзіся, пасадка на Бабруйск, на Менск, на Маскву". Саскочыла і дапамагла Настасі ўскласці мяшок на воз. Настася села побач з Домнай. Ззаду ішла, з мяшком за плячамі, Настасіна сястра Ніна. Яна крычала „па-ча-кай-це!" Але гул і лёскат трактара заглушаў яе вокліч. Яна не дагнала і засталася далёка позадзе.

Настася аглянулася, заўважыла яе, але не пасмела сказаць аб гэтым. Яна саромілася за сябе, за сястру, за жыццё такое. Хацела штосьці сказаць Домне, але не знаходзіла слоў. Адчула нейкую смушчонасць і прыніжэнне перад таварышкай, якая ўгаварвала яе працаваць разам у калгасе.

— Дзе-ж ваш конь,—запытала Домна.

Другі тыдзень як на ногі не ўстае. Наўрад ці што будзе. Конь—яшчэ поўбяды, але вось бацька пры смерці. Кідаецца, трызніць, гарачка тыфусная. Нікога пры ім не пакінулі. Мачыха злая. Загадала нам ісці ў поле, а сама бадзяецца. Не шкадуе яго. Да апошняга часу грызлася з ім. А ён такі добры ў нас.

— На сабе мяшкі валачыць—невялікая зайдрасць. Не жыццё гэта, Настася. Так нельга... Больш так нельга...—Домна прыгадала адвячорак, калі яна сядзела на сельсовецкім ганку і плакала. Каля яе праходзіў вясёлы гурт дзяўчат-калгасніц і яна бегла за імі, паўтараючы гэтыя-ж самыя словы: „так нельга"... Яна пачала расказваць пра сваё жыццё і работу ў калгасе.

А трактар гуў, фыркаў, імчаўся. Настасін позірк спыніўся на бясконцым, імклівым вярчэнні гусенічнай істужкі. Яна зноў адчула, як авалодвае яе думкамі, волей, імкненнем, пачуццямі гэтая непакорная машынная сіла. І перад ёй развінуліся ўяўляемыя малюнкі будучыні, якія калейдаскапічна мігацелі ў водблесках гусечных планак, кружыліся, мітусіліся, знікалі.

Трактар спыніўся. Настася скінула мяшок і ўскочыла ў хату. Бацька штосьці мармытаў спрасонку. Яго рыжыя густыя вусы ўздрыгвалі разам з верхняй губой. На ілбе сядзеў чырвоны, тоўсты, наліты крывёю клоп. Настася падышла, скінула яго на зямлю і раздушыла заскарузлай пятой. Нахілілася над хворым і дакранулася адваротным бокам далоні да яго твару. Бацька прачнуўся, спалоханымі вачыма глядзеў на Настасю. Яму паказалася, што гэта нейкая здань смерці навісла над ім. Настася міжвольна адступілася.

— Тата, вы мяне не пазнаеце.—Ціха прагаварыла Настася. Калі хворы апамятаўся, яго вусны заварушыліся і прашапталі ледзь чутныя словы:

— Настася... Без... Каня... Памру... Цяжка... Настася...

Спалохам, і жудасцю бліснулі вочы Настасіны.

— Ай!—вырвалася з грудзей яе.

***

Праз тры тыдні бацька ачуняў. Настася сядзела за сталом і прымярала рукавіцы яму. Бацька разчулена глядзеў ёй у твар і лагодная ўсмешка заварушылася ў

*) Пачатак глядзі ў № 20, 21 нашага журнала.

рыжых вусах яго. Настася лічыла гэты момант самым спрыяльным, для таго, каб выказаць яшчэ невядомае ў сям'і.

— Тата, заўтра мяне ў калгас прымаць будуць. Я заяву падала.

— Як? З хаты вытуру! Выродак, адшчапенец праклятый— бразнуўшы вобземлю міску, затупацела маці.

— Чаго вызверылася?—прыгразіў Апанас,—ты нам не ўказ! От я і падам, балазе і ачуняў крыху.

І такі гармідар Апанасіха падняла, што хата дагары вачалася. Апанас разважаў, што рабіць і намеркаваў адкласці да вясны. А Настасю ў калгас прынялі. Цэлых два месяцы калацілася хата ад спрэчак, лаянкі і сваркі.

Нарэшце, Настася перайшла жыць да Домны.

***

Студзеньская раніца на марозе рукі пацірае. І сонца пераліваецца колерамі ўсялякімі ва ўзорах марозных на шыбах нарысаваных.

— Раз, два, тры...

— Раз, два тры... Стаць на наскі... Рукі ўгару... Удых....—чуе Настася праз сон. Ёй здаецца чырвонаармейцы па вуліцы маршыруюць і Мікалай паперадзе ідзе. Чырвоная зорка на шлеме яго пад сонцам зіхаціць. І чуе яна каманду яго:

— Раз, два, тры... І трубы медныя маршам грымяць. Ёй хочацца бегчы дагнаць Мікалая, але з месца не зварухнецца, ногі нібы ў землю ўраслі. Яна хоча крыкнуць, але і крыкнуць не можна. Вусны нібы застылі. Яна напруджвае ўсе сілы свае, варушыцца мармыча. А ў вушах яе несупынна гучыць:

— Раз, два, тры... Яна расплюшчвае вочы. За сцяной, з клуба радыё-прыёмнік падае каманду. Рытмічна, у такт каманды па хаце маршыруе Домна. Яна паварочваецца, выгінаецца. Пластычныя рухі рук і ног вырысоўваюць розныя фігуры. І ў гэтых рухах адчуваецца нейкая свежасць і бадзёрасць. Нейкая магічная сіла прывабнасці і харaства ў іх затоена.

Настася з замілаваннем глядзіць на яе. Домна становіцца да яе тварам. Іх зіркі сустракаюцца. Настася міжвольна ўскхапляецца з пасцелі, хапае яе пад пахі і кружацца, кружацца яны. Залівісты смех з радыёмузыкай спалучаецца. Хата напаўняецца радасцю, бадзёрасцю, моладасцю перароджанай. І Настасі ўсё гэта здаецца нечым новым, незразумелым, небачным, захапляючым.

Раптам рыпнулі дзверы і на парозе з'явіўся Максім. Ён стаў як укопаны і вачам сваім не верыць. Настася схавалася за шафу, Домна, стаўшы ў струнку, павышаючы голас, па-ваеннаму, падроблена ў загадным тоне сказала:

— Без дакладу не ўваходзіць.

Паказала на дзверы:

— Пачакай там, пакуль адзенемся!

Максім вышаў. Першы раз у жыцці з ім здарылася такая рэч. Ніколі ён не перажываў такога сораму перад Домнай, як цяпер. Праз некалькі хвілін пачуўся голас:

— Можна!

Максім зайшоў сам не свой Не ведае, што і сказаць. Ён яшчэ не апомніўся ад уражання, якое толькі што ўспрыняў. Зачараваным стаяў і не знаходзіў слоў. Забыўся пра што яму і пытаць, што яму трэба. Домна здзіўлена глядзела на яго.

— Ну, што-ж, у госці прышоў? Калі ласка...

І гэтае, „калі ласка" прагучэла ў Максімавых вушах нейкай сапраўды ласкай, сяброўскай, таварыскай і разам з тым у гэтых словах чулася гордасць і па чуццё перавагі над ім. Ён адчуў сябе нікчэмным, прыніжаным, абражаным. Учуў, што Домна, гэта не тая падначаленая, пакрыўджаная жанчына, якая была жонкай яго. І такой прывабнай і любай здалася яна яму. Нездарэмна яго сюды цягнула паглядзець на жыццё яе. Цэлых два тыдні хадзіў ён і прычэпкі шукаў, як бы да Домны зайсці. Нарэшце, прыдумаў „прымус"—яго на цэлым сяле няма, а ў Домны ёсць. І вось ён выбраў такі неспадзяваны час, каб не падумалі, што назнарок гуляць прышоў. Прымуса, бач, пазычыць зайшоў, нібы жонка цяперашняя Тэкля прасіла, наштосьці ён там прыгадаўся.

І вось ён стаіць перад Домнай і вачэй не ведае дзе дзець.

Домна яго запрашае: „Сядай, доўгачаканы госць. Не саромся".

— Рана ў госці... За справай прышоў... Прымуса пазычыць жонка прасіла,—збянтэжана, блытаючыся, гаварыў Максім.

У гэты час перад яго вачмі маленькая Гэля выкарабкалася з пасцелі, дастала на ложкавым біле сваю мультановую цёмнасінюю сукенку і пачала яе вярцець і аглядаць складачкі, Настася дапамагла ёй адзецца.

(Працяг будзе)

Прывітанне журнала „Калгасніца Украіны"

Таварышам па зброі, селькорам-ударніцам, рэдакцыі і чытачкам журнала „Работніца і калгасніца Беларусі"—палкае большэвіцкае прывітанне!

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, журнал дабіўся не малых поспехаў у барацьбе за камуністычнае выхаванне і ўцягненне ў актыўнае соцыялістычнае будаўніцтва работніц і калгасніц Беларусі, у барацьбе за шырокі светлы калгасны шлях, які з адсталай, забітай, цёмнай сялянкі (пры капіталізме) ператварыў жанчыну ў вялікую сілу ў калгасе.

У радасны, урачысты дзень 10-гадовага юбілея жадаем яшчэ большых поспехаў у справе выхавання і арганізацыі работніц і калгасніц Беларусі на выкананне ўсіх палітычных і гаспадарчых задач 2-й пяцігодкі і ажыццяўлення ўказанняў нашага любімага мудрага правадыра тав. Сталіна аб смелым вылучэнні калгасніц на камандныя вышыні калгаснай вытворчасці, і ўздыма іх культурнасці на небывалую вышыню.

Няхай жыве наша слаўная комуністычная партыя, яе мудры вялікі правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве большэвіцкі друк,—самая вострая, самая моцная зброя партыі!

Няхай жыве журнал „Работніца і калгасніца Беларусі"—баявы арганізатар жаночых працоўных мас!

Адказны рэдактар усеукраінскага журнала „Калгасніца Украіны"—ПАЛЯКОВА

Wybitni ludzie pól socjalistycznych

Są jeszcze zupełnie młode. Każda z nich liczy niepełne 20 lat. To jednak ich wybitne czyny są dobrze znane nietylko w kolektywie „Internacjonał", lecz w całej radzie wiejskiej, w całym rejonie Dzierżyńskim. Cała społeczność radziecka również powinna znać swoich ludzi wybitnych.

* * *

Najpierw ludzie zdziwili się, potem oburzyli. Zwłaszcza nie mógł pogodzić się z decyzją kolektywu skończony hultaj Jan Łapa. Czyż to możliwe, by młoda, niepełnoletnia dziewczyna kierowała ogniwem doświadczonych oraczy, pracujących na roli od 20—30 lat?

Jednak zarząd dobrze wiedział, co robił, mianując Lidę Urbanowiczównę na kierownika ogniwa. Wiedział on dobrze, że w ciągu czterech lat uczciwej pracy w kolektywie. Lida otrzymała nie jedną premję. Wiedzieli wszyscy, że jej para koni wygląda lepiej, niż inne, że normę urobku dziewczyna stale wykonuje z nadwyżką.

Lida gorliwie zabrała się do pracy. Znikły szydercze uśmieszki i nieufność poszczególnych kolektywników. Wkrótce dziewczyna zaczęła się cieszyć powszechnym szacunkiem. Pod jej energicznem kierownictwem ogniwo oraczy zajęło czołowe miejsce w kolektywie. Istniejącą normę orki 0,50 ha stale przewyższano o 0,75—0,80 ha.

Zimą Lida ze swojem ogniwem pracowała przy zwózce drzewa. W jesieni—przy kopaniu kartofli. I na każdym odcinku pracy zawsze kroczyła na czele. Nawet Łapa Jan, wydalony z ogniwa za systematyczne łazikowanie obecnie przekonał się, że praca pod takiem

Lida Urbanowiczówna.

zwierzchnictwem nie ubliża, lecz jest zaszczytem.

Lida bardzo się chlubi tem, że kolektyw powierzył jej tak odpowiedzialną pracę i z dumą pokazuje swą książeczkę pracy, w której za 7 miesięcy zapisano 225 pracodni. Wytęża ona całą energję, by i nadal zachować swe miejsce czołowe.

* * *

Kamila Żybul pracuje w kolektywie już od 4 lat. Miała dopiero 15 lat, gdy w roku 1931 przydzielono do niej parę koni. Od tego czasu zimą i latem, na polu i w lesie pracuje ona bok—o bok z dorosłymi mężczyznami, zdumiewając wszystkich swoją niezłomną energją.

Zarząd kolektywu słusznie ocenił jej roztropność i energję i w roku 1933 mianował ją na kierownika ogniwa bronowaczy. Kamila nie zmieszała się, bynajmniej, gdy się dowiedziała o tak zaszczytnej nominacji. Mocno bowiem ufała w swe siły i była przekonana, że potrafi dowieść słuszności decyzji zarządu.

Ogniwo Kamili nie wiedziało, co oznacza niewykonanie normy urobku. Zamiast 0,75 ha, ogniwo bronowało codziennie 1,20—1.30 ha.

W zimie Kamila pracowała w charakterze brygadjera przy zwózce lasu. I na tym odcinku brygada z Kamilą na czele dała wzory pracy szturmowej. Nikt nie odważył się powiedzieć, że dziewczyna nie jest szturmowczynią: wyraźnie świadczą o tem 300 pracodni, które wpisano do jej książeczki w ciągu 9 miesięcy r.b.

* * *

Do r. 1930 Kamila była zupełnie niepiśmienną. Gorliwie zabrała się do likwidacji tej jedynej „wyrwy". Cztery lata uporczywej pracy dały świetne wyniki: obecnie posiada ona wiedzę w zakresie 7-miu klas szkoły powszechnej.

Janczukowicz.

ПЕРАМОЖЦЫ

А. БАРАШКАЎ

I

Нялёгка Гулідавай Ганне ўдалося арганізаваць маладзёжнае звяно па апрацоўцы ільну. А тут як знарок, з першых дзён работы якасць ільновалакна выходзіла нізкая і норма выпрацоўкі не выконвалася. Няўвязка ў рабоце хвалявала і непакоіла Гулідаву. Нямала дакаралі і старыя калгасніцы-ільнотрапальшчыцы.

— Эх і работнічкі! Палюбуйцеся на іх. Валакно толькі псуюць,—сыпаліся кпіны па адрасу маладзёжнага звяна.

— Ігрышчы спраўляць, а не лён трапаць—з гіроніяй дадавалі другія.

Гэтыя дакорлівыя і едкія словы наводзілі сум на маладых трапальшчыц. Станавілася соромна перад старымі, якія абганялі ў рабоце. Ім не хацелася глядзець у вочы і сустракаць кагонебудзь са старэйшых. Яны маўкліва ішлі з працы. Гэтую маўклівасць маладога звяна парушыў голас Ганны:

— Не сумуйце, дзяўчаты. Мы на практыцы пакажам старым, як моладзь працуе. Варта толькі нам пастарацца і праз пару дзён наша звяно будзе пераможцам.

II

У гэту ноч доўга не магла заснуць Гулідава Ганна. Цяжка было на сэрцы. Думкі ў галаве кружыліся пра адно, як лепш арганізаваць у звяне работу, каб выйсці з прарыва і сапраўды паказаць узорныя прыклады работы. Не на словах, а на справе, ударнай работай заваяваць перамогу. Яна ўважліва перабірала ўсё, што магло, па яе думцы, перашкодзіць у рабоце. Урэшце яна прышла да вынікаў, што асноўная прычына адставання ў тым, што не ўсе здолелі яшчэ асвоіць тэхніку апрацоўкі ільну. Ёй прыемна стала, што знойдзены прычыны. Значыцца непаладкі будуць ліквідаваны. Яна лёгка ўздыхнула, аддалася салодкай дрымотнасці і з усмешкай на вуснах заснула.

ФЕРМА ЎКЛЮЧЫЛАСЯ У КОНКУРС

МТФ калгаса „Наша праца", Клічаўскага раёна, пры арганізацыі налічвала толькі 30 галоў рагатай жывёлы. Зараз ферма налічвае 120 галоў. На ферме працуе 12 чалавек—5 даярак, 2 цялятніцы, 4 пастуха і загадчык фермы. Паміж імі разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Прыкладам добрасумленнай працы можа служыць лепшая ўдарніца — цялятніца Шамаль Варка, якая на ферме працуе на працягу трох год. За добраякасную працу праўленне калгаса прэміравала Варку тры разы.

Вось што расказвае яна аб сваёй рабоце:

— Я перадала ўжо ферме 17 цялят маёй гадоўлі і зараз рыхтую для перадачы яшчэ 20 цялят. Гляджу я за імі, каб здаровымі былі, хваробы іхнія вывучаю. Ну, і пакуль што спраўляюся з работай. Аднойчы я ўзялася даглядаць зусім слабога бычка, глядзела за ім, як за дзіцянём, і зараз ён важыць 128 *кг*. А яму яшчэ толькі 7 месяцаў.

Крыху памаўчаўшы, яна працягвала:—не простая гэта справа! Добрае вока тут патрэбна...

Другая лепшая даярка Ізох Ганна, два разы прэміравана. Яна раней за ўсіх з'яўляецца на працу, і пакуль астатнія работніцы з'явяцца на работу, у яе ўжо ачышчаны кармушкі і падрыхтован корм. Яна ніколі не лічыцца з гадзінамі, а працуе так, як гэтага вымагае справа.

У выніку сумленнай і адданай работы, такіх ударніц як Шамаль Варка і Ізох Ганна—ферма поўнасцю выканала мясапастаўкі дзяржаве за 1934 год з перавыкананнем на 440 *кг*, якія залічваюцца ў 1935 год, а таксама малакапастаўкі.

На зіму ферма забяспечыла сябе ўсімі неабходнымі кармамі.

Тормазам у развіцці пагалоўя фермы з'яўляецца адсутнасць сваёй пашы. Лясная-ж паша, якая скарыстоўваецца фермай, знаходзіцца на вялікай адлегласці. Вялікім недахопам таксама з'яўляюцца—недастаткова падрыхтаваныя кароўнікі да зімоўкі, і непоўны пераход на здзельную аплату работніц фермы.

У мэтах знішчэння гэтых недахопаў і далейшега паляпшання сваёй работы, ферма ўключылася ў конкурс на лепшую даярку. Паміма конкурсных абавязкаў работніцамі высунуты цэлы рад сустрэчных абавязацельстваў, у выніку якіх усе работніцы замацавалі сябе за фермай да канца другой пяцігодкі, падпісаліся на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі" і надалі ферме гэтую назву. **Ючкова.**

ПЕРАМОЖЦЫ

(Канец)

III

У дзве гадзіны ночы на мяльна-трапальным пункце распачынае сваю работу маладзёжнае звяно. Начную цішыню парушае вясёлы гоман і ціхія спевы:

— Чаго распелася? — ласкава супакойвае Гаўрыленкаву Гулідава,—давай хутчэй прыступаць да працы.

Заспяваў сваю песню электраматор. Засакаталі шэсцяронкі, мялкі і спрытна завіхаліся за работай ударніцы.

— Лён сёння прасушан добра,— аглядзеўшы змятую жменю валакна,—прагаварыла Гулідава,— весялей, дзяўчаты, час не чакае.

— Ноч праходзіла і ўсё радзей станавіўся папяловы змрок. Набліжаўся дзень. Непрыкметна за работай бягуць гадзіны. Не адстаюць і маладыя змагары за пяршынства. Ударнае звяно заканчвае работу. Вось ужо апошні сноп трасты падан у ільномялку і голас Ганны пасля доўгай маўчанкі прагучэў у паветры:

— Выключай рубільнік. Праца скончана. Можна ісці дахаты снедаць. Пасля адпачынку, роўна ў вызначаны час з'явіцца на працу.

IV

— Глядзі, няўжо скончылі мяць трасту,—прышоўшы на работу, здзіўлена загаварыла Аўсеенкава Вольга.

— Трэба праверыць,—унесла прапанову Масеенка Маланка—жонка брыгадзіра.

Пры гэтых словах Масеенка першая пашла правяраць еўні, дзе некалькі гадзін таму назад была нямятая траста.

— Ударнікамі хочуць стаць!— ні то з крыўдай, ні то з вялікай зайздрасцю ўсхвалявана распачала гутарку Маланка.

— Пагавары больш і ты станеш „лепшай ударніцай"—заўважылі калгасніцы.

Ад нечаканасці такіх едкіх кпін, у Маланкі твар загарэўся чырванню, губы задрыжэлі ад моцнага абурэння. Яна стаяла нібы згубіўшы што і з крыўдай глядзела на калгасніц. Хацела сказаць нешта брыдкае, але стрымалася і нервова прагаварыла:

— Бярыце вы прэмію. Яна мне непатрэбна. Я і без гэтага абыйдуся.

— Табе і не дадуць, бо ты не заслужыла яе,—дружна ў адзін голас прагаварылі трапальшчыцы. Трэба больш працаваць рукамі, а не мянціць языком.

Злосць агарнула яшчэ больш, але пасля такіх слоў спрачацца было няёмка. Яна пастаяла крыху ў задуменні, а потым прыступіла да працы. Не ўступала ў спрэчкі сёння Маланка з другімі калгасніцамі, а маўкліва жменю за жменяй трапала лён. Ёй станавілася сорамна, што яна адстала ад другіх трапальшчыц. У гэты дзень Маланка дала больш ільнапрадукцыі ў параўнанні з мінулымі днямі, але далёка не дасягнула тэмпаў Аўсеенкавай Аўдулі, якая штодзённа атропвае па 20—22 фунты ільнавалакна.

Праходзілі дні ўпартай барацьбы за лён, за пяршынства і перамогу. Работа праходзіла бесперабойна і кожны новы дзень прыносіў новыя перамогі. Лічбы гаварылі ў карысць маладзёжнага звяна.

Восем маладых ільнотрапальшчыц апрацавалі і здалі дзяржаве каля 8 цэнтнераў высокаякаснага ільнавалакна, тады як брыгада ў ліку 28 жанчын здала 20 цэнтнераў. Акрамя тропкі ільну маладзёжнае звяно пераапрацоўвае па 6—7 еўняў трасты ў дзень.

Весела і ўдарна праходзіць работа на мяльна-трапальным пункце. Сум знік у дзяўчат і на змену яму прыйшла бадзёрасць.

— Глядзі, пальцы зноў не падсунь пад трапала,—перасцерагае Гулідава трапальшчыцу Клыкоўскую Марфу.

— Не турбуйцеся. Гэта не першыя дні на рабоце,—жартаўліва адказвае Марфа.

Так сваёй ударнай работай маладзёжнае звяно заваявала перамогу.

Калгас „Чырвонае Чубакова",
Цілівіцкага сельсовета,
Дубровенскага раёна.

Заможнае жыццё сям'і Семяновічаў

У 1918 годае на канцы вёскі Кляпчаны стаяла старая хата Семяновічаў. Вокны параўняліся з зямлёй і хата ўся нагадвала сабой стары грыб.

Гаспадара ў хаце не было. Ён са зброяй у руках пашоў у рады Чырвонай арміі. Назад бацька Семяновічаў не звярнуўся. Загінуў у баях. Засталася ўдава Семяновіч з 6 малымі дзецьмі. Тыднямі сядзелі малыя без хлеба, заліваліся слязьмі і праклінялі сваё жабрацкае жыццё.

Хутка памёрла і маці. Тады самай старэйшай дачцы Улляне было ўсяго 17 год. Маладой дзяўчыне давялося стаць гаспадаром. Выйдзе, бывала, Улляна ў поле—за плугам яе малую не відаць. Не яна плугам кіруе, а плуг ёю.

Час ішоў. Пачалі падрастаць браты і сёстры. Тады Улляне стала крыху лягчэй. Але ўсё-ж як ні стараліся Семяновічы працаваць, не маглі яны выбіцца з жабрацкага жыцця. Ніколі свайго хлеба не хапала. Трэба было пазычаць. За пуд пазычанага хлеба ў кулакоў Улляне і малодшай сястры Куліне прыходзілася ў жніво адпрацаваць па некалькі дзён.

Пры арганізацыі калгаса ў вёсцы Кляпчаны, сям'я Семяновічаў уступіла першай. Куліна адразу пачала працаваць на свіной ферме. Улляна, Прося і Мікалай—на палявых работах.

За чатыры гады бесперапыннай работы на свінаферме, Куліна добра асвоіла сваю работу, авалодала тэхнікай свінагадоўлі. Цяпер Куліна—брыгадзірша. Палюбіла яна сваю работу. Прыходзіць на свінарнік заўсёды першай. Правярае ўсіх свіней і пасля гэтага прыступае да раздачы корма.

За чатыры гады работы ў калгасе, Куліна праявіла сябе, як лепшая ўдарніца. Яе свінні—лепшыя ў калгасе. За 9 месяцаў Куліна выпрацавала 360 працадзён.

Работа ў калгасе з'яднала сям'ю Семяновічаў. Усе яны працуюць па-ўдарнаму. Малодшая сястра Мар'я выпрацавала на палявых работах 160 працадзён. Брат Мікалай таксама не хоча адставаць ад ўсіх, ён мае 350 працадзён.

Аднойчы Мікалай пачаў падленьвацца ў рабоце. Сёстры адразу заўважылі гэта. Увечары ў часе вячэры Куліна і Мар'я пачалі гутарыць з Мікалаем.

— Калі ты не падцягнешся ў рабоце, мы будзем патрабаваць ад праўлення, каб ад цябе забралі ўдарную кніжку—гаварылі сёстры.

Мікалай паслухаў сясцёр. Сорамна яму стала за свае паводзіны. Ён падцягнуўся ў рабоце і зноў стаў лепшым ударнікам у брыгадзе.

Куліна, Мар'я і Мікалай спаборнічаюць паміж сабой на палявых работах. Усе яны маюць ударныя кніжкі. Куліну больш 6 разоў калгас і палітаддзел прэміравалі: бацінкамі, плашчом, хусткай, мануфактурнай і грашыма.

* * *

Сям'я Семяновічаў жыве ў калгасе „Комбайн" заможна і культурна. За 9 месяцаў яны выпрацавалі 1 077 працадзён. Да канца года яшчэ выпрацуюць не менш 200—250 працадзён. На працадні яны з калгаса атрымаюць 220 пудоў зернавых, 733 пуда бульбы, і грашыма 360 руб.

Замест старой халупы, сям'я пабудавала сабе новы дом, усе прыгожа апрануліся. Не даводзіцца больш гараваць без хлеба. Яго не толькі хопіць на ўвесь год, а яшчэ і засганецца. Свае лішкі хлеба сям'я Семяновічаў прадала ў гэтым годзе дзяржаве (6 центн.), ды яшчэ мяркуюць прадаць. Яны купілі сабе некалькі пар ботаў, пальто, шоўкавую хустку і іншыя рэчы.

Так былая, амаль жабрацкая сям'я, пры непасрэднай дапамозе палітаддзела, ператварылася ў сям'ю заможную і культурную.

Я. Кучар, П. Санько

Слупкі раён.

ПРЫКЛАДНАЯ ДАЯРКА

Нікуловіч Вера.

У мэтах развіцця соцыялістычных метадаў працы ў калгасна-таварнай жывёлагадоўчай ферме, для паляпшэння работы даярак, Наркамзем і Палітсектар Наркамзема БССР абвясцілі конкурс на лепшую даярку.

З вялікай зацікаўленасцю абмяркоўвалі абвешчаны конкурс даяркі малочна-таварнай фермы калгаса „Чырвоная зорка", Кішча-Слабодскага сельсовета, Барысаўскага раёна.

Пасля абмеркавання, даяркі ўключыліся ў конкурс, бяручы на сябе абавязацельствы: датэрмінова выканаць пастаўкі мяса і малака, павялічыць удой, арганізаваць лепшы догляд цялят і т. д.

За час уключэння ў конкурс, маецца значны зрух у рабоце фермы. Палепшылася масавая работа, заключаны індывідуальныя соцумовы паміж даяркамі МТФ калгаса „Чырвоныя трасцяніцы", за даяркамі замацаваны каровы і кожная з іх адказвае за сваю работу. Поўнасцю выкананы пастаўкі мяса і малака, павялічана пагалоўе цялят. Замест 35 штук па плану гадуюцца 40 штук, удой павялічыўся на 10—15 літраў у дзень.

Добра падрыхтавалася ферма і да зімы. Загадчык фермы тав. Круглік гаворыць: „наша жывёласустракае цёплую і сухую зімоўку". І сапраўды, калгаснікі добра ацяплілі кароўнікі, ашклілі вокны, насыпалі на столь лісцяў, моху і саломы; забяспечылі жывёлу кармамі: сілосам, сенам, саломай, кораньплодамі і т. д.

— Цяпер нам зіма не страшная,—кажа т. Круглік.—Наша ферма дабілася гэтых дасягненняў дзякуючы ўпартай рабоце такіх ударніц ініцыятараў, як тав. **Нікуловіч Вера**, якая працуе год даяркай. Яна з'яўляецца ў нас лепшым арганізатарам соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Прымацаваныя да яе каровы выглядаюць лепш чым у іншых і больш даюць малака. Яна часта бярэ на грамадскі буксір адстаючых.

Ход соцспаборніцтва і выкананне ўзятых самаабавязацельстваў правяраюцца два разы ў месяц на сходах работніц фермы, дзе на месцы выпраўляюцца дапушчаныя недахопы і абмяркоўваюцца задачы далейшай работы.

Б. Л.

Владз. Глазырын.

Маладая сіла

(Урывак з п'есы)

Поле. Адбывалася выпрабаванне прадахраніцельнай трубкі трактара, якая вынайдзена комсамольскай брыгадай пад кіраўніцтвам комсамолкі Каці.

Начальнік палітаддзела, Таварышы, дазвольце мне ад імя палітаддзела МТС адкрыць лятучы мітынг. Таварышы, моладзь не толькі па-ўдарнаму можа працаваць, моладзь можа вынаходзіць — рабіць рэволюцыю ў апрацоўцы соцыялістычных палёў. Комсамольцы-ўдарнікі нашай МТС вынайшлі прыстасаванне, якое захоўвае асноўную прыладу нашай вытворчасці — трактар і прымушае яго ў два разы працаваць больш. Вось яны ганаровыя маладыя людзі нашай МТС: таварыш Каця, таварыш Максім і Пыхцееў, таварыш...

Пыхцееў. І я ў комсамольцы трапіў?

Андрэй. Праз год у піонеры перавядуць, Пыхцевіч, такі час, што людзі не старэюць, а маладзеюць.

Каця. І таварыш Андрэй.

Начальнік палітаддзела. Можна і яго, акадэміка...

Апладысменты, гарманіст іграе туш.

Начальнік палітаддзела. Слова мае тав. Пыхцееў.

Пыхцееў. Я так сказаць, калі скажам да прыкладу. Калі сонца свеціць і на душы радасна, то так сказаць, бліжэй да справы... і мяне старыка папёрла, так сказаць... Галоўнае дысцыпліна і правільны падыход да вытворчасці. А дысцыпліна і парадак— гэта галоўнае.

Адным словам радасны дзень у нас сёння, шчасце маладое, як неба галубое, вось у чым сутнасць і любоў. Эх да што-ж там, чалавек я да разгавора незвыклы. І так вам зразумела, што калі высока ляцець, высо-о-о-к-о-а, мацней трэба за зямлю, мацней...

(Апладысменты, гармонік іграе туш. Пыхцееў з Кацей адыходзяць улева).

Пыхцееў. Ну, Кацюша, а наконт асабістай справы.

Каця. Што за справа?

Пыхцееў. Можаш?

Каця. Ой, ды што вы...

Пыхцееў. Не чырванейі..

Начальнік палітаддзела (падыходзіць). Гэта добра, што чырванее. Добра. Чырваней, Каця, чырваней...

Пыхцееў. Таварыш начальнік...

Начальнік палітаддзела. Ну, Ну...

Пыхцееў. Яшчэ адно, яшчэ адно пытанне не вырашана.

Начальнік палітаддзела. Што за пытанне? Вырашыць сёння ўсе пытанні.

Каця. Кіньце, Кузьма Мацьвеевіч.

Пыхцееў. Выбачайце, справа брыгадная, агульная...

Начальнік палітаддзела. Ну, ну...

Пыхцееў: Пажаніць трэба...

Начальнік палітаддзела. — Каго?

Пыхцееў:—Іх...

Начальнік палітаддзела. Каго іх?...

Пыхцееў: Моладзь... Ударную...

Начальнік палітаддзела. Бласлаўляю...

Пыхцееў. Згодны, Каця?..

Каця. (Маўчыць)

Пыхцееў. Калі маўчыш, значыць згодна...

Каця. Дык ён... Ужо любіць кагосці...

Пыхцееў. Што?.. Ды як ён адважваецца, ды ён-жа мне гаварыў... Не, пачакай...

Пыхцееў. Максімка!..

Максім Ну, што там?..

Пыхцееў. Дуй сюды!..

Максім. Чаго?..

Пыхцееў. На галопе сюды!..

(Максім падыходзіць).

Максім. Ну?..

Пыхцееў. Адказвай, як следчаму... Любіш?..

Максім. Чаго?..

Пыхцееў. Не чаго, а каго!..

Максім. Люб... Люблю...

Каця. Я-ж казала...

Пыхцееў. Адказвай каго?..

Максім. І радзіму, і...

Пыхцееў. і... і...

Максім. І дзяўчыну...

Пыхцееў. Па якому праву?

Максім. А ці-ж нельга?

(Каля іх збіраецца народ).

Пыхцееў. Не маеш права...

Максім. Не, не... Не люблю...

Пыхцееў. Адказвай, любіш?

Максім. Люблю.

Пыхцееў. Чаму сказаў не люблю?

Максім. Так, саромлюся...

Пыхцееў. Адказвай — не муч другіх... Каго любіш?..

Максім. Дзяўчыну...

Каця. Мне няма часу, я пайшла...

Пыхцееў. Выбачайце, ваша месца тут. Не цягні, Максім, гаварыў...

Максім. Ка...

Пыхцееў. Каго?

Максім. Ккацю...

Каця. Хлусіць... Смяецца...

Максім. Не смяюся я...

Пыхцееў. А тады-ж мне гаварыў...

Максім. Праўда гаварыў. Але дагаварыць баяўся. Потым Каця, таварыш Андрэй... Ну адным словам...

Андрэй. О-го-го-го... Здорава... Ды я ўжо тры гады, як жанаты... Ха-ха-ха... Угрыз, ну і ўгрыз...

(Усе смяюцца).

Пыхцееў. Цяпер ваш адказ, Кацярына Уласаўна. А вы?..

Каця. Я...

Максім. Вы... Таварыш Пыхцееў, як быццам адвакат...

Начальнік палітаддзела. Па брака-зводным справам...

(Усе смяюцца).

Пыхцееў. Правільна, адвакат. Адна брыгада. Не будзеш адвакатам, ці-ж гэты дзівак сам скажа. Ніколі ў жыцці! Смеласці не хопіць. Справа прападзе. А яна-ж справа — наша агульная. Сіла! Калектыў!

Каця. Максімка, любы!.. (абнімае Максіма).

Максім. Ка... Ка... Ккацюша!.. а я думаў ты з Андрэем...

Каця. (Смяецца).

Начальнік палітаддзела. А ну пашлі ў Загс усім мітынгам.

Сямён (уваходзіць). Дазвольце, а я то як, я Каця...

Каця. Вы будзеце лётаць... Нам з вамі не па шляху...

Пыхцееў. Высока паляцеў, табе на зямлю сесці цяжка, таксама лётнікі...

Начальнік палітаддзела. Вось яна, таварышы, моладзь. Добрая моладзь. Ладная. Упартая. Радасная. Сарамлівая. Чырванее.

Паглядзіце чырванеюць. Добра, добра! У гэтым сіла, рэбяткі!

Андрэй. Маладосць—сіла! Гэта ты, бацька, правільна сказаў. Сіла ў калгасе—на поле, сіла на заводзе, у шахце. Сіла ў Чырвонай арміі. Ды ўся-ж Чырвоная армія—вы, такая-ж моладзь. Вывучаная, тэхнічна пісьменная. Радасная і шчаслівая, а гэта галоўнае—радасная і шчаслівая...

Начальнік палітаддзела. І чырванее...

Андрэй. Чырванее, бацька, дальбог чырванее. Ды ці-ж з такой моладдзю нас пераможа хто? О-го-го-го!.. Хай сунуцца, на кавалкі парвем!.. А ўсё любоў, любоў да радзімы... І любоў маладая — шчаслівая любоў да дзяўчыны...

Няхай жыве моладзь! Няхай жыве маладая шчаслівая сіла, шчаслівая як шчаслівая наша сацыялістычная радзіма!

(Гарманіст грае: „Усё вышэй, і вышэй, і вышэй“...)

Бухцілаў

Сям'я Гэлькі

Прачнуўшыся Лішай Гэлька хутка апранулася і выйшла на ганак. Зірнуўшы ўгару на блакітныя прасторы неба, яна радасна ўздыхнула:

— Прыемны дзянёчак! Радасны!

Яна пацягнулася ўсім сваім загарэлым целам, быццам скідала з сябе лянівы сон. Потым звярнулася ў хату і падышла да ложка:

— Майсей, уставай галубок. А то сонца застане ў пасцелі...

— Зараз я! Праз сон цягнуў хударлявы, пажылы Майсей—муж Гэлькі.

Далёка за лесам узнімалася сонца, асвятляючы праменнямі кожную хату. Вёска прачыналася. Па вуліцы чуўся рэдкі гоман даярак і цялятніц, якія спяшаліся на работу. Майсей закурыў папіросу, хрыпла адкашляўся і хутка накіраваўся на скотны двор.

Гэлька клапацілася па гаспадарцы. Скончыўшы сваю работу, яна накіравалася ў хату і села каля вакна. Лёгкі ветрык варушыў кудлатыя кусты віргіні ў палісадніку. Воддаль па дарозе круціўся віхор белаватага пылу. Гэлька ўтаропіла вочы на гэты віхор і ледзь адрозніла чорныя абрысы легкавой машыны.

— Палітаддзельская,—разважала яна.

Машына, паблісквaючы ў промянях сонца, набліжалася да Гэлькінага двара. Праз некаторы час яна нячутна спынілася каля самага ганка. З кабінкі вылезла маладая жанчына, якая, спыніўшыся, паправіла складкі сваёй спадніцы, чорную шапачку і закурыла папіросу.

Двор быў маленькі, чысты, утульны. Праз загарадзь адусюль прыветна глядзелі кудлатыя вішні і слівы. На ганку з'явілася Гэлька. Яна адразу спазнала тав. Якуш і ўсміхнулася. Якуш, узышоўшы на ганак, прывіталася і яны разам, жвава размаўляючы, накіраваліся ў хату. Невялікі, ўтульны пакойчык ветліва сустрэў іх чыстатой і сваім ўбраннем. На стале і вокнах стаялі кветкі, а па кутах рослыя вазоны, з якіх кудлата выглядалі фікус і церна.

Лішай Гэлька.

Якуш з цікавасцю аглядала фота-здымкі з гісторыі сям'і і кніжкі, што ляжалі акуратна складзенымі на паліцах.

Задаволеная аглядам, яна села за стол і, кінуўшы погляд на Гэльку, пачала размову:

— Дык значыцца гаспадарыш, Гэлька... У заможнасць падаешся?

— Памаленьку расцем!.. Працуем па-ўдарнаму вось і жывем заможна. А сям'я ў нас дружная. Я працую гародніцай, Майсей—у кароўніку, Ліда і Ліпа вучацца, а старэйшая Маруся працуе на заводзе „Цапей Галя“. Шустрая яна дзяўчынка ў мяне. А што да жыцця, то самі бачыце—радасна жывем. Працу нашу шануюць... Што-ж патрэбна больш?

— Гэта яшчэ не ўсё, Гэлька! Больш заможнасці, больш культурнасці патрэбна. Вочы Гэлькі засвяціліся агеньчыкамі. Нібы нешта ўспомніўшы, яна працягвала размову:

— Днямі мы з Майсеем разважалі. Мне пажадана паступіць на курсы, вучыцца хочацца. А Майсей супакойвае: не быць нам інжынерамі. Давай лепш купім тое-сёе.

Гэлька спыніла гутарку і нахмурылася. Некалькі хвілін моўчкі яна глядзела ў вочы Якуш. Потым дадала:

— Ды яно і абрастаць зразу неяк нязвычна. Не жылі мы так, як цяпер... Тут яна задумалася і непрыкметна перайшла да успамінаў мінулага:

— Усё жыццё бедавала, батрачыла ў Сенніцкіх кулакоў: Макоўскага, Рублеўскага, Трацэўскага і Сіпнеўскага. Працавала за траіх: касіла, арала, а яны банкеты спраўлялі, насміхаліся... Гэлька ўздыхнула, нібы скінуўшы з сябе гора, і ажывілася:

— А цяпер не тое. Цяпер мы апрануты, абуты, смачна ядзім. Усяго ў нас у дастатку. Добра, каб і надалей было так.

— Надалей,—перабіла Якуш,—надалей лепш будзе, Гэлька! Ударна працуючы на палях, змагаючыся за лепшае жыццё, патрэбна мець у сваёй хаце і культурны адпачынак. Я табе, Гэлька, раю правесці радыё. Па радыё перадаюць лекцыі, растлумачваюць незразумелыя пытанні. Гэта будзе карысна для Майсея і для цябе.

— Яно добра было-б,—узнялася Гэлька,—але дзе знайсці спецыяліста?

— Знойдзем, Гэлька! На днях я дашлю механіка, ён табе усё і абсталюе.

— Ды ўжо-ж трэба як небудзь, а то і сапраўды сумнавата неяк...

— Развітваючыся з Гэлькай, Якуш цёпла паціснула яе руку:

— Ну Гэлька да пабачэння! Спадзяюся хутка пачую ў тваёй хаце гукі радыё, пабачу газеты і журналы, а ты мне скажаш, што вы не толькі заможныя, але і культурныя.

Гэлька падзякавала і правяла госця да машыны. На вуліцы вечарэла. Чуваўся лёгкі шум заведзенага матора. А праз некаторы час машына мільганула ў цені шэрай дарожкі і знікла.

Менскі раён

Сустрэнем зіму з падрыхтаванымі свінарнікамі

ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах абавязаў партыйныя і совецкія арганізацыі скончыць не пазней кастрычніка будаўніцтва і рамонт памяшканняў для зімоўкі жывёлы. Устаноўлены тэрмін прайшоў, зіма надыходзіць, а многія фермы асобных соўгасаў і калгасаў далёка яшчэ не падрыхтаваны.

Рамонт і ацяпленне свінарнікаў—работа першай чаргі, якую нельга адкладваць ні на адзін дзень.

Кіраўнікі свінагадоўчых гаспадарак павінны зразумець, што яны перш за ўсё персанальна адказваюць не толькі за падрыхтаванасць свінарнікаў да зімы ў тэрмін, але і за якасць зробленага рамонта. Практыка мінулых гадоў паказала, што гаспадаркі, якія не клапаціліся аб ацяпленні свінарнікаў, мелі большы адыход парасят, большае расходванне кармоў і рад іншых адмоўных з'явішч.

Свінарнік, у якім скончан рамонт, павінен быць цёплым, сухім і светлым. Каб забяспечыць апаросныя цэхі тэмпературай не менш 8—10 градусаў цяпла, а для астатняга паталоўя 6—7 градусаў, печы свінарніка неабходна паправіць і праверыць да надыходу халадоў. Калі на ферме печаў няма, іх трэба пабудаваць з разліку на 12 матачных станкоў, плошчаю ў 60—70 квадратных метраў, адну печ. Печы трэба рабіць з цэглы і толькі ў крайнім выпадку дапускаецца ўстаноўка жалезных печак, ужыўшы ўсе меры перасцярогі ад пажару.

Стрэхі, якія маюць шчыліны і дзіркі, праз якія можа пранікаць дождж і снег, павінны быць неадкладна залатаны. Сцены і столь неабходна ацяпліць, пазатыкаць шчыліны, на столь трэба насыпаць пласт сухой зямлі, торфу ці пілавіння. У свінарніках, у якіх столь пабудавана з жэрдак і аполкаў, неабходна спярша замазаць пазы глінай, змешанай з саломеннай сечкай, пластам у 2—3 сантыметры. Зверху трэба насыпаць пласт зямлі на 15—20 сантыметраў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на падлогу свінарнікаў. Нахіл падлогі павінен быць у 1,5—2 сантыметры на кожны метр даўжыні. Пустату паміж падлогай (насцілам) і грунтам трэба абавязкова запоўніць глінай, шчэбнем, вугольным смеццем і другімі матэрыяламі, якія ізалююць падлогу ад вільгаці глебы.

Фундамант ахоўвае свінарнік ад пранікнення ў яго халоднага паветра знізу, якое вельмі шкодна для парасят. А таму абсыпка яго пластам зямлі ў 20 сантыметраў вышынёй і 70 сантыметраў шырынёй будзе адначасова ацяпляць свінарнік і служыць адводам для вады.

Вентыляцыя адыгрывае надзвычай важную ролю ў стварэнні санітарна-гігіенічных умоў у стойлавы перыяд. Лепшай сістэмай вентыляцыі з'яўляецца кінгоўская. У сярэднім лічыцца нармальным 81 квадратны сантыметр адтуліны выцяжной трубы на кожную дарослую галаву. Для таго, каб вентыляцыя працавала спраўна, у трубах не павінна быць шчылін, зазораў паміж страхой і трубой. Засоўкі ў трубах для рэгулявання паветра неабходна падагнаць шчыльна. Ад столі да страхі трубы ацяпляюцца саломеннымі матамі, а зверху страхі трубы павінны мець дзве сцяны, адлегласць паміж якімі забіваецца торфам або пілавіннем.

Каналізацыя. Уся сістэма каналізацыі павінна быць ускрыта, адрамантавана і добра ачышчана, бо ад каналізацыі ў большай меры залежыць сухасць памяшкання, чыстата паветра, г. зн. галоўная ўмова для здароўя жывёлы. Сточныя жалабы павінны быць пакладзены з нахілам у 1—1,5 сантыметра на кожны метр. Апрача таго трэба не даць магчымасці праходзіць знізу халоднаму паветру і скразняку пры адкрыванні знадворных дзвярэй. Для гэтага трэба забяспечыць свінарнік парогамі і тамбурамі.

Апрача рамонту, свінарнік неабходна ўважліва прадэзінфекаваць. Ва ўмовах сырой восені лепш карыстацца сухім спосабам дэзінфекцыі, прымяняючы нягашаную або хлорную вапну. Вапнай трэба карыстацца вельмі асцярожна, бо няўважлівае абыходжанне з ёю можа атруціць жывёлу.

Толькі тады, калі будуць праверaны ўсе дробязі, пачынаючы ад абсталявання станкоў завесамі, кручкамі і канчаючы капітальным рамонтам, пры ўмове, калі ўсе выкананыя работы агледзіць рабочая камісія з абслугоўваючага персанала, толькі тады можна лічыць свінарнік падрыхтаваным да зімоўкі свіней.

Кіраўнікі свінагадоўчых гаспадарак разам з усімі рабочымі соўгасаў і калгаснікамі павінны забяспечыць выкананне ўсіх гэтых мерапрыемстваў, якія значна павысяць прадукцыйнасць свінагадоўлі.

Не паўтараць памылак мінулых гадоў, сустрэць зіму ўсебакова падрыхтаванымі—баявая задача рабочых свінасоўгасаў і калгаснікаў.

М. Хасман.



ГАДОЎЛЮ МАЛАДНЯКА— ДАРУЧЫЦЬ ПРАВЕРАНЫМ ЛЮДЗЯМ

(Пісьмо калгасніка)

У калгасе „3-ці рашаючы" справе жывёлагадоўлі аддаецца недастаткова ўвагі. Гадоўля цялят даручана праўленнем калгасніцы Капітковай Польцы, якая дрэнна адносіцца да сваіх абавязкаў. У выніку гэтага два цялёнка пала.

Згодна закона, з Капітковай трэба было вылічыць 15 проц. працадзён за падзеж цялят па яе віне, але праўленне калгаса гэтага не зрабіла.

Трэба даверыць догляд цялят праверaным людзям, лепшым ударніцам, якія-б даглядалі маладняк, як сапраўдныя калгасныя гаспадары.

Калгасмік.

Магілеўскі раён.

1290

1964 г.

РУЧНАЯ ПРАЦА



Малюнак **ВЫСЕЎКІ.**

Тлумачэнне да выкрайкі дзіцячай сукенкі на 12 год

На малюнку паказана сукенка, якая шыецца з шэрсці альбо тонкага бумазею. Уперадзе трэба зрабіць веер (трайная сустрэчная складка). На гэты веер патрэбна напускаць матэрыял так, як паказана пункцірам і стрэлкай. Пасак, манжэты і канты фальбоны патрэбна страчыць шырокім швом у пяць радоў.

У спражку паска працягваецца гальштук. Уперадзе, каля каўняра, прарэз зашпільваецца на гузік і прасоўваецца гальштук з такой-жа самай матэрыі.

Як перанесці выкрайку з журнала на газету і як павялічыць яе, глядзі тлумачэнне у № 20, 19 18 нашага журнала.

РАБОТНІЦЫ, КАЛГАСНІЦЫ, ЖОНКІ РАБОЧЫХ, ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІЦЫ!

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ЖУРНАЛ „Работніца і калгасніца Беларусі“ ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ 2 РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

КОШТ ПАДПІСКІ:

1 месяц—20 кап., 3 м-цы—60 кап., 6 м-цаў—1 руб. 20 кап., 1 год—2 руб. 40 кап.

Падпіску здавайце на пошту альбо лістаносцам. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая 63, 3-ці паверх, пакой 11.

Выданне ЦК КП(б)Б **Ч. в. а. адказнага рэдактара Г. М. АЛЯКСЕЕВА**

Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая 65, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1343. Тыраж 18.450. Уп. Галоўлітбела № Л 5831.

Здана ў набор 29-XI—34 г. Падпісана да друку 7/XII—34 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.